ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

ГПБ Ср. Аз

№ 2
СТУДЗЕНЬ
1930 г.

УСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД КАЛГАСЬНІЦ

Не паслабляць пільнасьць.

Мірнае становішча на Кітайска-Ўсходняй чыгунцы адноўлена. Кітайская ўлада, нагла захапіўшая Кітайска-Усходнюю чыгунку і стварыўшая шэраг бясчынств і зьдзекваньняў над савецкімі грамадзянамі, вымушана была прыняць умовы Савецкага ўраду.

На працягу 5 з лішнім месяцаў канфлікту Савецкі ўрад прымаў усе захады, каб мірным шляхам зьнішчыць гэты канфлікт.

Адмаўляючыся прызнаць законным гвалтоўны захоп К.-У. чыгункі, даючы рашучы адпор усякім спробам кітайскіх генэралаў і белагвардзейскіх банд на-



Заняткі чырвонаармейцаў на кітайскай мяжы.

падаць на нашу тэрыторыю, Савецкі ўрад ізьяўляў у той-жа час поўную гатоўнасьць урэгуліраваць канфлікт шляхам непасрэдных перагавораў з кітайскім урадам.

Гэтага не хацелі дапусьціць капіталістычныя дзяржавы, якія даўно імкнуліся прысвоіць сабе Кітайска-Ўсходнюю чыгунку. Пагэтаму яны пад маскай „міратворцаў" усяляк пыталіся ўмяшацца ў нашы перагаворы з кітайскім урадам і ў той-жа час штурхалі кітайскіх генэралаў на абвастрэньне канфлікту.

Але Савецкі ўрад даў рашучы адпор усялякім спробам замежных імпэрыялістых умяшацца ў нашы справы. Пытаньне аб Усходня-Кітайскай чыгунцы павінны былі вырашаць: Савецкі Саюз, як гаспадар чыгункі і Кітай, на зямлі якога пабудавана дарога і які быў дабраахвотна прыцягнуты Савецкім Саюзам да кіраваньня чыгункай.

Савецкі ўрад прад'явіў наступныя патрабаваньні: 1) аднавіць на Кітайска-Ўсходняй чыгунцы становішча, якое існавала да канфлікту, 2) безадкладна прызначыць Савецкага кіраўніка чыгункі і яго памочніка, 3) вызваліць з турам незаконна арыштаваных і падвяргаючыхся жорсткім праьледаваньням савецкіх грамадзян.

Гэтыя патрабаваньні Савецкі ўрад не зьмяніў і пасьля таго, калі кітайскія генэралы пацярпелі поўнае паражэньне.

Спробы капіталістычных дзяржаў натравіць Кітай на вайну з намі сарваліся. Абараняючыся ад налётаў белагвардзейскіх банд і кітайскіх часьцей наша армія цьвёрда праводзіла палітыку міра, але калі высьвятлілася, што ідзе сур'ёзная падрыхтоўка да нападу на Савецкія межы, наша армія нанесла сакрушыцельны ўдар, які прымусіў у паніцы бегчы кітайскае войска.

Вялікія гаспадарчыя страты, якія панёс Кітай ад развалу на чыгунцы, паражэньне ў захопніцкіх плянах, прымусілі Кітайскі ўрад уступіць у перагаворы і прыняць умовы, якія былі прапанованы Савецкім Саюзам спачатку канфлікту. 22 сьнежня падпісан пратакол аб аднаўленьні мірнага становішча на Кітайска-Ўсходняй чыгунцы. Назначаны Савецкі кіраўнік дарогі і яго памочнік. Аслабанены арыштованыя савецкія грамадзяне.

Перамога на Кітайска-Ўсходняй чыгунцы нашай мірнай палітыкі ў значнай меры зьявілася вынікам вялікай згуртаванасьці, гераічнай моцы нашай Чырвонай арміі. Аб гэтым павінна памятаць кожная работніца і працоўная сялянка. Таму клопаты аб Чырвонай арміі, якая пільнуе нашу мірную працу, нашу сацыялістычную стройку—павінны быць важнейшай задачай.

Кожная працоўная жанчына павінна рыхтаваць сябе, праз таварыства Асоавіяхіму, для таго, каб заўсёды быць гатовай абараняць сацыялістычную краіну.

„Беларуская Работніца і Сялянка"

З студзеня 1930 году будзе выходзіць 3 разы ў месяц.

Падпіску можна здаваць на пошту, лістаносцам, у кіёскі ці прысылаць непасрэдна ў рэдакцыю.

Часопіс каштуе— у месяц: . . . . 20 капеек | Паўгода. . . 1 р. 20 капеек
3 месяцы . . . 60 „ | Год . . . . 2 р. 40 „

Цана асобнага нумару 10 кап.

Падпішчыкі, здаўшыя грошы раней, атрымліваюць часопіс без даплаты.

Упаўнаважаныя па падпісцы атрымоўваюць 10 проц. з сабранай сумы.

Кожная актывістка, грамадчыца, дэлегатка, работніца, калгасьніца, саўгасьніца, бяднячка і сераднячка—павінна чытаць сваю часопіс „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА".

Кожная актывістка павінна распаўсюджваць гэту часопіс.

Чытайце, распаўсюджвайце і пішэце ў сваю часопіс.

Адрас рэдакцыі: Менск, вул. Карла Маркса, 14, тэлефон—2-43.

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

№ 2 | ОРГАН АДДЗЕЛУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК ЦК КП(б)Б | Студзень, 1930 г.

ПЕРАМОЖНА БУДУЕМ САЦЫЯЛІЗМ.

Каляктывізуем усе бядняцка-серадняцкія гаспадаркі ў два гады. Канчаткова ліквідуем кулакоў-эксплёататараў.

Ва ўсіх капіталістычных дзяржавах, дзе ўлада знаходзіцца ў руках паноў і фабрыкантаў, шырокія масы працоўнага сялянства, гэта значыць беднаты і сераднякі, ня маюць магчымасьці ўзьнімаць свае гаспадаркі, а прымушаны працаваць на пана і кулака. Багацее пан і кулак, усё больш і больш пралетарызіруюцца беднякі і бяднеюць сераднякі. Паны і кулакі нажываюцца за кошт абядненьня шырокіх бядняцка-серадняцкіх мас.

Так было і ў нас да Кастрычнікавай рэвалюцыі, пакуль рабочыя ў саюзе з працоўным сялянствам пад кіраўніцтвам Камуністычнай Партыі не прагналі паноў і фабрыкантаў і не стварылі пралетарскай дзяржавы.

Умовы Савецкага ладу стварылі шырокія магчымасьці для ўзьняцьця сельскае гаспадаркі і палепшаньня эканамічнага становішча бядняцка-серадняцкіх мас.

Шлях, які дае магчымасьць па сапраўднаму ўзьнімаць сельскую гаспадарку, зьліквідаваць беднасьць, некультурнасьць, малую прыбытковасьць сельскае гаспадаркі—гэта шлях каляктывізацыі, шлях аб'яднаньня дробных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у буйныя каляктыўныя гаспадаркі, у якіх магчыма ўжыць складаныя сельска-гаспадарчыя машыны, высокую тэхніку і навуку, і, працуючы каляктыўна, высока ўзьняць вытворчасьць працы і павялічыць прыбытковасьць.

Дасягнутыя посьпехі нашай краінай у галіне будаўніцтва буйнай сацыялістычнай прамысловасьці яшчэ больш узмацнілі кіруючую ролю рабочае клясы ў адносінах да сялянства, стварылі ўмовы для шпаркага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы і ліквідацыі кулацтва як клясы эксплёататараў і заядлых ворагаў батрацтва, беднаты і сераднякоў.

Бядняцка-серадняцкія масы зразумелі і на практыцы пераканаліся ў пераважнасьці каляктыўных форм земляробства над дробнай індывідуальнай гаспадаркай. Гэтым і тлумачыцца, галоўным чынам, тое вялікае імкненьне шырокіх мас працоўнага сялянства ў калгасы, якое мы маем за апошні год.

Апошні год у сапраўднасьці зьяўляецца годам вялікіх дасягненьняў у сацыялістычнай перабудове сельскае гаспадаркі.

Аб тым, што ў калгасы пайшлі тысячы і сотні тысяч бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак, досыць яскрава гаворыць павялічэньне плошчы пад калгасамі БССР, толькі за апошні год, з 94 тысяч гэктараў да паўтара мільёна гэктараў, ці павялічэньне больш як у 15 разоў. Ня мала мы маем ужо на Беларусі такіх раёнаў, дзе каляктывізаваны ўсе бядняцка-серадняцкія гаспадаркі. Уся Магілеўская акруга каляктывізавана звыш 60 проц. Гэта значыць, што па Магілеўскай акрузе з кожных 100 гаспадарак, 60 гаспадарак ужо арганізаваліся ў калгасы. А па ўсёй БССР каляктывізавана звыш 20 проц. усіх гаспадарак.

Улічваючы такі нябывала шырокі рух бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы, Пленум ЦК КП(б)Б, які адбыўся ў пачатку студзеня, даручыў усім партыйным арганізацыям пабудаваць працу так, каб на працягу двух год, гэта значыць да канца 1931 году, поўнасьцю каляктывізаваць усе бядняцка-серадняцкія гаспадаркі БССР.

Разам з гэтым Пленум даручыў усім арганізацыям палепшыць усю работу і ўзьняць на вышэйшую ступень усё калгаснае будаўніцтва, як мага хутчэй зьліквідаваць маючыяся недахопы, а іх ня мала.

Што трэба для таго, каб калгаснае будаўніцтва было палепшана і каб хутчэй узмацняліся калгасы?

Першае і галоўнае, трэба, каб бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, якія ідуць у калгасы, не прадавалі сваёй маёмасьці—коняй, кароў, будынкі, насеньне, сельска-гаспадарчы інвэнтар, дробную жывёлу і інш., а ўсю сваю маёмасьць унасілі ў калгасы. Чым больш будзе ў калгасе маёмасьці, тым хутчэй такі калгас замацуецца, а гэтым самым і палепшацца матар'яльныя ўмовы насельніцтва калгасаў.

Другая задача—гэта неабходна як мага хутчэй абагуліваць маёмасьць у калгасах, ствараць непадзельныя капіталы. Бо чым больш непадзельных капіталаў, чым паўней абагулены сродкі вытворчасьці, тым мацней калгас, тым менш спрэчак паміж калгасьнікамі.

І нарэшце трэцяя задача—гэта трэба добра арганізаваць працу ў калгасах. Неабходна разьмеркаваць усіх калгасьнікаў так, каб кожны ведаў, што ён павінен рабіць і за што адказваць. Разьмеркаваньне прыбыткаў, ці, як кажуць, аплату працы ў калгасах наладзіць так, каб тыя калгасьнікі, якія працуюць старанна і лепш, каб яны і больш атрымлівалі. Многа яшчэ можна было пералічыць сур'ёзьнейшых задач. якія стаяць непасрэдна перад калгасьнікамі і калгасьніцамі, але ўсіх іх у артыкуле не пералічыш.

Кожная батрачка, сялянка—бяднячка і сераднячка павінна добра зразумець, что ным хутчэй

ГПБ Ср. Аз.

мы каляктывізуем усе бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, тым хутчэй будзе ўзьнімацца сельская гаспадарка, павялічвацца таварнасьць, паляпшацца эканамічнае становішча і ўзьнімецца культурны ўзровень працоўных.

Зразумела, што ў калгасе на вярбе самі абаранкі, ці бліны, як гэта кажуць, не растуць, трэба працаваць, каб магчыма было забясьпечыць патрэбы калгасьнікаў, але каляктыўная праца ў калгасах, калі працаваць дружна, значна больш дае карысьці чым у індывідуальнай дробнай гаспадарцы. Нават пры самай нізкай тэхніцы і простых сельска-гаспадарчых машынах калгасы маюць магчымасьць павялічыць ураджайнасьць палёў. Няхай будзе ўсім вядома, што толькі пад аднымі межамі, якія апрача ўбытку нічога ня даюць, знаходзяцца 7 гэктараў на кожныя 100 гэктараў зямлі, якая парэзана на палоскі. Калі скасаваць толькі адны межы, то пасеўная плошча па БССР пашырыцца амаль на паўмільёна гэктараў.

Зусім зразумела, што перабудаваць сельскую гаспадарку на соцыялістычны лад. поўнасьцю каляктывізаваць бядняцка-серадняцкія гаспадаркі магчыма толькі пад кіраўніцтвам рабочае клясы і яе камуністычнай партыі, толькі пры непасрэднай дапамозе з боку рабочае клясы. Таму і камандыруюцца ў дапамогу працоўнікам вёскі 600 чалавек лепшых пралетарыяў і 200 чалавек адказных працаўнікоў з гораду. Апрача гэтага, будуць арганізаваны і камандыраваны спэцыяльныя рабочыя брыгады на правядзеньне пасеўнай кампаніі.

Каляктывізацыя сельскае гаспадаркі не па нутру кулаку. Калгас у вачох кулака самая страшная для яго штука. Таму кулакі ўсімі мерамі вядуць і будуць вясьці шалёную барацьбу супроць арганізацыі калгасаў і іх арганізатараў.

Ня ўсе бяднячкі і сераднячкі разумеюць, чаму кулак супроць калгасаў, ці чаму ён, пралезшы ў калгас, стараецца яго разбурыць знутры?

Кулак супроць калгасаў таму, што *калгасы выбіваюць з-пад яго кулацкіх ног тую аснову, на якой ён трымаецца.* Кулак багацее не таму, што ён сам працуе, такіх „дурных кулакоў“ няма, а ён багацее таму, што эксплёатуе батракоў, беднякоў і сераднякоў. А калі батракі і беднята разам з серадняками арганізуюцца ў калгас, то кулаку няма тады такой магчымасьці нажывацца, бо няма каго эксплёатаваць. Вось чаму кулакі супроць калгасаў, чаму яны вядуць такую шалёную барацьбу супроць калгасьнікаў.

Кулакі ніколі ня будуць падтрымліваць калгасы, яны *пастаянна будуць заядлымі ворагамі калгаснага будаўніцтва, шалёнымі клясавымі ворагамі батрацтва, беднаты і сераднякоў.*

Ніколі ня трэба верыць кулаку ці кулачцы, калі яны просяцца ў калгас і абяцаюцца быць добрымі калгасьнікамі. Такімі „ласкавымі“ яны прыкідваюцца для таго, каб, пралезшы ў калгас, пачаць разбураць яго знутры.

Вы хочаце запытацца, а што тады зрабіць з кулакамі, калі іх нельга пускаць у калгасы? А вось што: *кулакоў трэба ліквідаваць як клясу. У калгасы іх ні ў якім разе ня трэба пускаць і выгнаць іх з тых калгасаў, куды яны сумелі пралезьці і адабраць у кулакоў тую маёмасьць, якую яны ўнесьлі ў калгас і іх пай.* Усё гэта павінна застацца для карыстаньня калгасьнікаў, батракоў, беднякоў і сераднякоў. Трэба таксама ўсюды адабраць ад кулакоў усю пляменую жывёлу, лепшыя будынкі, сельскагаспадарчыя машыны, млыны і іншыя прадпрыемствы. Адабраць ад іх усе лепшыя землі і абавязкова высяліць іх з тэрыторыі калгасаў. *Проста кажучы кулакоў трэба раскулачыць, адабраць ад іх эканамічную базу. Трэба канчаткова перамагчы і зьліквідаваць кулацтва, як клясу.*

Калгасьніцы павінны пільна сачыць за дзейнасьцю кулацтва. Ніколі ня трэба слухаць кулацкай хлусьні, нібы ў калгасах „прыкладаюць пячаткі“, „усе разам сьпяць“ і гэтак далей. Гэта кулакі распускаюць розныя чуткі, каб сялянкі—бяднячкі і сераднячкі дапамаглі кулаку змагацца супроць калгасаў. На сялянскіх сходах часта супроць калгасаў выступаюць жанчыны кулачкі, а іх сям-там падтрымліваюць па сваёй цемнаце бяднячкі і сераднячкі, не разумеючы таго, што *жанчыны-кулачкі такія-ж ворагі як і мужчыны-кулакі.* Трэба кожнай бяднячцы і сераднячцы ведаць, што кулак-мужчына, ці жанчына-кулачка ўсёроўна зьяўляюцца клясавым ворагам. Таму ніякай падтрымкі не павінна ім быць, а актыўна трэба дапамагаць, хутчэй арганізоўваць калгасы і канчаткова зьліквідаваць кулацтва.

Дэлегацкія сходы калгасьніц павінны дапамагчы ў справе ўцягненьня бядняцка-серадняцкіх колаў жанчын вёскі ў калгаснае будаўніцтва ў барацьбу за канчатковае зьнішчэньне кулацкай гаспадаркі.

Міцькоў.

Узьняць актыўнасьць калгасьніц.

Моцны калгасны рух, які маецца ў апошні час, яскрава сьведчыць аб тым, што шырачайшыя бядняцка-серадняцкія масы ўсьвядомілі, што толькі праз савгасы і калгасы магчыма ўзьняць ураджайнасьць сельскай гаспадаркі і палепшыць становішча асноўных мас сялянства. Таму бурнай хваляй пашлі бядняк і серадняк у калгасы.

Ужо зараз мы маем значны ўздым сельскай гаспадаркі ў выніку каляктывізацыі. Калі ў 1917 годзе калгасы і савгасы давалі каля 80 мільёнаў пудоў хлеба, дык у 1929 годзе яны далі ня менш 400 мільёнаў пудоў. Рост прамысловасьці, рост калгасаў і савгасаў складае ўмовы для таго, каб цалкам зьнішчыць кулацкую гаспадарку і поўнасьцю замяніць яе вытворчасьцю калгасаў і савгасаў.

Таму зараз камуністычная партыя высунула задачу — ліквідаваць кулацтва як класу—гэта значыць зьнішчыць кулацкую гаспадарку, адабраць у кулака сродкі вытворчасьці, якімі ён эксплёатаваў батрацтва, беднату і серадняка.

Правядзеньне раскулачваньня цесна зьвязана з суцэльнай каляктывізацыяй і яно праводзіцца самімі-ж бядняцка-серадняцкімі масамі.

Кулак аказвае дзікае супраціўленьне нашаму сацыялістычнаму наступленьню, бо суцэльная каляктывізацыя вядзе да зьнішчэньня кулацкай гаспадаркі. У гэтай барацьбе з калгасамі кулак скарыстоўвае ўсе сродкі і ў прыватнасьці імкнецца скарыстаць адсталую частку бяднячак і сераднячак у сваіх мэтах. Ён разнаю хлысьнёю, паклёпам імкнецца запалохаць несьвядомых жанчын. У Буда-Кашалеўскім раёне быў выпадак, калі кулакі падкупілі жабрачку, якая хадзіла па вёскам і казала, што яна зьбірае кавалачкі хлеба, бо ў калгасе, у якім яна нібы састаіць,—няма хлеба. Пад уплывам кулацкай агітацыі ў цэлым шэрагу мейсц жанчыны не згаджаліся ўступаць у калгасы, нават былі выпадкі, калі яны зрывалі сходы, на якіх прымаўся статут калгаса.

Таму ў барацьбе з кулаком значную ролю адыгрывае жанчына калгасьніца. Калгасьніца-актывістка павінна рашуча змагацца з спробамі кулака, пацягнуць за сабой адсталую масу жанчын. Яна павінна даваць жорсткі адпор спробам кулака сарваць арганізацыю калгасаў, пралезьці ў калгасы з мэтай разлажэньня яго знутры. Яна павінна актыўна ўдзельнічаць у тым, каб ачысьціць калгасы ад кулакоў і іншых варожых людзей, пралезшых у калгасы. Пасачыць, ці ня пралез у калгас нават у дэлегацкі сход „кулак у спадніцы" і ці не праводзіць ён там сваю агідную работу.

Калгасьніца актывістка павінна дапамагчы ў справе ўцягненьня бядняцка-серадняцкіх мас жанчын вёскі ў калгасы, растлумачыць ім перавагу каляктыўнага гаспадарнічаньня.

Усё гэта патрабуе значнага ўздыму актыўнасьці і культурнага ўзроўню, *клясавай сьвядомасьці* саміх калгасьніц. Калгасьніца павінна больш актыўна ўдзельнічаць у справе вырашэньня ўсіх грамадзкіх і гаспадарчых пытаньняў жыцьця калгасу.

Зараз увага ўсёй масы калгасьніц павінна быць накірована на тое, каб палепшыць гаспадарку калгасу, дабіцца яго ўзбуйненьня, шляхам далучэньня беднякоў і сераднякоў акаляючых вёсак. Калгасьніцы павінны дабівацца хутчэйшага абагульваньня маёмасьці калгасьнікаў, сродкі вытворчасьці і жывёлы, бо гэта дасьць магчымасьць хутчэй палепшыць эканамічнае становішча калгасу.

Дэлегаткі Ўсесаюзнага Зьезду калгасьніц.

Неабходна дабівацца палепшаньня і разьвіцьця новых галін гаспадаркікалгасу.

Пашырэньне жывёлагадоўлі, лепшы догляд жывёлы, разьвіцьцё гародніцтва, садаводзтва, птушніцтва — усе гэтыя пытаньні павінны абгаварыць калгасьніцы на агульных сходах.

Разьвіцьцё раду галін гаспадаркі, асабліва жывёлагадоўлі, птушніцтва, дасьць магчымасьць больш правільна скарыстаць жаночую працу ў калгасах. Зараз яшчэ наглядаецца, што ў шэрагу калгасаў жаночая праца скарыстоўваецца толькі каля 148 дзён у гаду і, галоўным чынам, на падсобных работах. Каб палепшыць свае жыцьцё самі калгасьніцы павінны дабівацца ўзьвышэньня вытворчасьці працы і сваёй кваліфікацыі. На курсах, якія праводзіліся для калгасьнікаў у шэрагу мейсц: трактарыстаў, сыравараў і іншых, пасылалася зусім мала жанчын. Калгасьніца павінна дабівацца большай пасылкі жанчын на гэтыя курсы, а таксама абучэньня іх для працы на сельска-гаспадарчых машынах.

Мала жанчын на кіруючай рабоце ў калгасах і ў праўленьнях; між тым для таго каб узьняць актыўнасьць калгасьніц у гаспадарчым і грамадзкім жыцьці, неабходна большае вылучэньне жанчын на кіруючую работу ў калгасе. Шляхам прымацаваньня найбольш падрыхтаваных калгасьніц да праўленьняў і паасобных галін гаспадаркі, мы павінны рыхтаваць кіраўнікоў з жанчын-калгасьніц.

Падняцьце прадукцыйнасьці, карыснасьці працы жанчын-калгасьніц залежыць і ад бытавых умоў кал-

гасу. Між тым бытавое абслугоўваньне пастаўлена яшчэ слаба і самі калгасьніцы часьцяком гэтых пытаньняў ня ўзьнімаюць, таму неабходна дабіцца, каб самі калгасьніцы ўзяліся за перабудову свайго быту.

Неабходна на летні час, каб у буйных калгасах былі зарганізаваны ясьлі-пляцоўкі. Арганізацыю ясьляў трэба ўключыць у плян вясеньняй пасеўнай кампаніі. Пры жыльлёвым будаўніцтве калгасаў трэба прадугледжваць пабудову памяшканьняў пад ясьлі, агульныя сталоўкі і пральні. У гаспадарча-замацаваўшыхся калгасах пераход на агульнае харчаваньне зьяўляецца важнай задачай.

Перабудова быту на новых началах дасьць больш часу для працы ў агульнай гаспадарцы, а таксама для вучобы.

Для таго, каб сапраўды быць застрэльшчыцай у справе ўцягненьня ў калгасы бяднячак і сераднячак вёскі, жанчына-калгасьніца павінна ўзьняць свой культурны ўзровень. Таму пагалоўнае зьнішчэньне няпісьменнасьці зьяўляецца першачарговай задачай. Дэлегатка актывістка павінна растлумачыць кожнай няпісьменнай жанчыне, дапамагчы ўцягнуць яе ў лікпункт, арганізаваць навучаньне на даму для тых, хто ня зможа наведваць лікпункт.

Усе гэтыя пытаньні працы сярод жанчын у калгасах павінны шырока абмеркаваць дэлегацкія сходы калгасьніц. Па прыкладу рабочых гораду яны павінны быць наперадзе ў справе ўзьняцьця вытворчай дысцыпліны, арганізацыі ўдарных брыгад у калгасах. Дэлегацкія сходы зараз-жа павінны распачаць сацыялістычнае спаборніцтва паміж сабою на лепшую працу па ўцягненьню бяднячак і сераднячак у калгасы, на лепшы ўдзел у пасеўнай кампаніі, абагульваньне жывёлы, палепшаньне розных галін гаспадаркі калгасу, па арганізацыі бытавых устаноў.

Дэлегацкія сходы калгасьніц павінны да сваёй работы прыцягнуць бядняцка-серадняцкія масы жанчын вёскі, каб на прыкладах сваёй працы паказаць перавагу калякты ўнага жыцьця. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі арганізаваць масу бяднячак і сераднячак для рашучай барацьбы з кулацтвам.

Кулак зьяўляецца зьлейшым ворагам нашай сацыялістычнай стройкі.

Аб гэтым павінна памятаць кожная калгасьніца, яна павінна ўзброіцца для барацьбы з кулацтвам для поўнага зьнішчэньня кулацкай гаспадаркі, для згуртаваньня працоўных жанчын вёскі вакол справы калякты візацыі.

Рагазіньнікава.

КАЛГАСЬНІЦЫ ПІШУЦЬ

Падкулачнікаў прэч з дарогі.

У вёсцы Смалоўкі ёсьць падрыўшчыкі справы каляктывізацыі. Такія людзі, як Мікіта Палонін—былы стражнік, Раткевіч Іван—

Дэлегаткі Ўсесаюзнага Зьезду калгасьніц.

давайце коняй, кароў, біце сьвіней, рэжце авечак" — падгаварваюць яны сялян.

Раткевіч Іван даўно вядомы вясзасуджаны за выкрыўленьне клясавай лініі, Раткевіч Антон—запісаліся ў калгас для таго, каб разбураць справу каляктывізацыі, агітуюць супроць каляктываў.

Калі-ж бедната і сераднякі, наперакор клясавым ворагам, аб'ядноўцца ў калгасы то Раткевічы шкоднічаюць з другога боку: „Праковай беднаце. Працуючы ў сельсавеце, ён рабіў такое шкодніцтва: пленум сельсавету зацьвердзіў прапанаваныя групай беднаты сьпісы для здавальненьня хлебам. Перапісваючы гэтыя сьпісы, Раткевіч выключыў з іх беднякоў, замяніўшы тымі, якія прадаюць хлеб.

Агітацыю супроць лініі партыі праводзіць яшчэ Люба Малоціна, якая працуе ў Валанавіцкай каапэрацыі. Малоціна—дачка былого дзяка, таму зараз у каапэрацыі ад яе маюць пашану—папоўскія дзеці, былыя стражнікі, толькі не бедната.

Трэба рашуча ўдарыць па прымазаўшымся падкулачнікам, якія перашкаджаюць сацыялістычнай перабудове вёскі.

Сеньненскі раён, Віцебскай акругі.

Амушкіна.

Камуна „Авангард".

Скуратаўскі сельсавет першаю да суцельнай каляктывізацыі. Камуна „Авангард" аб'яднае ўвесь сельсавет. Гэта самая большая камуна Круглянскага раёну. Яна з беднякоў і сераднякоў. Першымі ў камуну запісаліся бяднячкі, за імі пачалі запісвацца сераднячкі. А заможныя, як убачылі такое імкненьне ў калгасы, ад злосьці пабеглі дамоў з сходу. На заўтрашні дзень каля студні кулакі грызьлі бяднячак, біць кідаліся з каромысламі.

Але кулацкія пагрозы не затрымалі. Зараз камуна „Авангард"—гонар нашага раёну.

Сялянка.

В. Скураты.

(Аканчаньне)

Дзяніс шкрабануў патыліцу, кашлянуў і, пад нос прабурчаўшы „Дабранач“,—вышаў з хаты.

Арына ня выйшла за ім, ахапіла галаву, з усяе сілы сьціснула яе рукамі. Болі ня чула яна, бо нутро ўсё палала атрутнай гораччу,—пякло. На грудзях яна адчула ўзвалены цяжэнны груз, а к горлу падкаціўся вялізны, кастравы клубок. Раз, другі праглынуць яго паспрабавала. Няма рады. Нешта душыць, пакутна гняце.

Арына ўявіла шэлест паперы. Вось, настрочаны розныя дакумэнты, даведкі, па ім касьцістая рука ляпае пячаткаю. Лісты разьлятаюцца, шапацяць, сыплюцца, засыпаюць усю яе, з галавою душаць. Пакутна-балючы стогн вырваўся ў яе, расплыўся, змоўк.

— Да Сяргея пабегчы зараз? Пачакаць раніцы?

Узяла з сабою. У кішэні ні шчылінкі. Выходзіць — пячатка скрадзена.

На што?

Вядома ня так сабе: злаўжываньне, ці помста?.. А можа тае і другое—ліхаманкава мяркуе Арына, сударгава сьціскае галаву.

— Хто-б мог быць? Чыя рука?

Лукаш пры людзях казаў: „Закапаю“. Гэта іх работа. Помсьцяць за тое, што на сходзе казалі. „Зямля—дзяржаўная. Пад калгас суцэльную паласу адвядзем“. Хутары выходзіць па шапцы. У гразь перад вёскаю хочуць утаптаць.

Адняла рукі. Сашчапіла іх. Балюча хруснулі пальцы.

— Як-жа людзям сказаць пра такое? „Баба-бабаю—скажуць,—ня ўпільнавала“.

Ну, так. Маўчаць нельга. Заўтра абвесьцім. Злаўжываньне перасячэм. Але нехта зларадзіць зараз, ды і ад людзей зьнявага. Такая страшэнная зьнявага.

Марозам агарнула ўсю яе. Яшчэ гусьцей сталі хмары. А за вакном яшчэ зьлей закружыла завея, віхрастая мяцеліца.

— Хоць-бы раньне хутчэй. Зараз у раён пайду, у РВК, Райком партыі. Далажу пра ўсё. Дапамогуць. Абяцалі сакратаром прыслаць камуніста, дапамагчы. На сходзе даложым, чые гэта штукі. А на вясну наперакор Лукашом—ярыну каляктывам засеем; палова вёскі з намі.

Застугнела вуліца, рыпнулі вароты. Арына ўздрыгнулася, ускочыла з лавы. На двары задрыжаў срэбрам пякучы, зімовы досьвітак.

— Так... так... Раньне ўжо. Ноч мінула... сплыла...

Нехта стукнуў у дзьверы. Стук гэты адбіўся ў галаве маладзіцы.

— Так і ёсьць,—Дзяніс за пячаткаю. Што сказаць яму: маніць далей, ці на чыстую?

Вядома, на чыстую. Сяргея паклічам. Разам будзем выйсьця шукаць.

У хаце яшчэ цёмна. Устала. Сланяючыся, чыркнула запалку, лучыну засьвяціла. У сенцы вышла. Там, у паўзмроку, сьпінаю да яе, нечая постаць, дзьверы прычыняе. Кінулася, за плечы трасе.

— Дзяніс, браце, родны, нячасьце!

— Я не Дзяніс—пазнае яна голас Сяргея.

Рукі павісьлі. Аслупянела.

— Чаго ён у такі час?

Праз парог ступілі. У хаце ўжо. Урасьлі на мейсьце, гледзячы адзін на аднаго.

— Дзівуешся, браце? Дзе пячатка?

— Адкуль ён ведае? Што гэта?

— Вось яна!

Сяргей працягнуў руку к камінку, праменьні пакоўзнуліся па далоні, асьвяцілі цёмныя агрызкі гумы.

Па целу разьлілася млявасьць. Арына прысела на лаву. Сяргея за сабою пацягнула.

Адкуль?

— А вось як. Пасьля сходу я скмеціў на руцэ сінюю пляму. Думаю: „Ня браўся за пісаньне, адкуль узялося?“ Разглядзеў. Пазнаў досыць выразны водціск пячаткі. Мяне агарнула неспакойства. Стаў прыпамінаць: каму руку даваў. Успомніў. У хату зайшоў я пры лямпе. На двары, к сьнегу—крыху сьвятлей. Калі злазіў з возу, бачыў некага ў сябе пад вакном. Ля парога сустрэў Лукаша, руку падаў яму, толькі яму. А рука вільгатная, мокрая была, ад талага сьнегу.

Маркотна зрабілася: чаго людзі ў мяне пільнуюць пад воканьнем? Ды і пячатка гэта скуль? Глянуў, а вакно цёмнае, лупае на мяне. Пайду, думаю, зачыню вакяніцы.

Вышаў. Сьнегу ня многа, ветрам неяк выдувае з-пад сьцен. Схапіў вакяніцу, гляджу: у мяне пад нагамі вялізарныя цёмныя плямы расплыліся.

Што гэта?

Грабнуў, і намацаў вось гэтыя кавалачкі гумы, садранай з пячаткі. Пазнаеш?

Абедзьвюма рукамі Арына схапіла руку Сяргея, моцна сьціснула яе, прагаварыла:

— Сяргей, родны, наша пячатка, сельсавецкая. Дык вось ён хто злодзей: вораг зубасты, сьвядомы злачынца.

* * *

Раніца маладая, сьвежая, бы сама вясна. Сонца выплыла і плаўна пакацілася ўгару. Яно рассыпае агністае золата, песьціць клейкія, толькі разгорнутыя лісьці кустоў. Смуглявыя дудачкі травы тужацца сьмела, праразаюць дзясны вільгатнай глебы.

Загаманіў лес. Раніца абудзіла птушак.

Абагрэты праменьнямі сонца ажыў матылёк, задрыжалі яго крыльлі над полем.

А поле ледзь дачакалася вясны. Яно дыхае сакавітай глебай, зеленью, гноем. Поле кліча людзкія рукі.

Людзі таксама прагна чакаюць вясны, сонечнай, блакітнай. Людзі чакаюць вясны працавітай, радаснай. А гэту вясну чакаюць па новаму, нябываламу. Вясна нясе новую працу, гуртавую.

Блішчаць адрамантаваныя плугі, просяць працы. Гарыць ядраное, адсартаванае зярно, просіцца ва ўзьбітую пасьцельку—глебу, каб зноў адрадзіцца, жыць, квітнець, і за працу—аддзякаваць хлебам.

Коні рвуцца на поле.

Сёньні некаторым ноч сьцяглася, ледзь дачакаліся раніцы. Сёньні вялікае сьвята, сьвята новага калгасу „Чырвоны Прамень", сьвята перамогі новага жыцьця.

Сёньні калгасьнікі ўпяршыню гуртом выходзяць сеяць яравыя.

І калі зайграў аркестр, прывезены з раёну, у малых і старых на твары зайгралі ружы, бы па загаду ва ўсіх шпарчэй застукала сэрца, усе пачулі некую дзіўную мэлёдыю.

Усе, як адзін, выйшлі ў поле, а там столькі сонца, сьвежасьці! Зялёнае ўбраньне здалося захапляюча ўрачыстым. Несказана багатай выглядала кожная новая раллля.

Ралля рэзала сьмела адвечныя межы, хванабэрыста зіхацела, бегла далёка, далёка.

К вечару ўзворанае—вокам ня зловіш.

І чамусьці стамлёнасьці няма. Бы сонца вясны маладое, бы неба блакітнае сьвецяцца вочы, якія сёньні ўбачылі новую працу.

Гуртом зварочваліся дамоў. Не хацелася разыходзіцца па хатам, вабіла яшчэ і яшчэ гаварыць усё пра тое-ж, пра калгас.

Але вось пачынае зьмяркаць. Стада трэба даглядзець.

Рассыпаліся бы мурашкі.

А калі ўжо зусім сьцямнела, Арына была ў Сяргея—старшыні калгасу.

— Вось маеш, новыя заявы прынесла, да нас, у калгас просяць прыняць.

— Хто?

— Аж семнаццаць сямей.—Арына назвала іх.

— Абмяркуем. Яны нашы, можна будзе прыняць. Пай закласьці за некаторых прыдзецца. Заўтра пасяджэньне ў нас. Будзеш?

— А як-жа.

Сяргей паклаў у скрынку заявы. Арына памаўчала некалькі хвілін, а пасьля загаварыла:

— Я да цябе яшчэ па аднэй, вельмі важнай, справе.

Сяргей глянуў на Арыну, зразумей недаказанае.

— Ты больш пісьменны. Напішы, браце, заяву.

— Цьвёрда парашыла?

— Так. Ня сёньні думка прышла.

Сяргей моцна, па-сяброўскі сьціснуў руку Арыны.

— Сама добра напішаш. Сядай.

Сяргей падаў Арыне аркуш паперы і аловак.

Арына схілілася над сталом і цьвёрда вывела:

— „Буду цьвёрда ісьці па Ленінскаму шляху. Прашу ячэйку прыняць мяне ў шэрагі камуністычнай партыі".

Калі ішла Арына дамоў, веснавы вечар для яе быў яшчэ больш маладым, сьвежым, а вецер—жвавым, гарачым, агністым.



Дэлегаткі Ўсесаюзнага Зьезду калгасаў.

Работніца, дапамагай у будоўлі калгасаў!

Праз шэфства горада над вёскай замацуем яшчэ больш змычку рабочых з асноўнымі масамі сялянства. Каляктывізацыя—галоўная задача шэфтаварыства. Работніца, актыўным удзелам у шэфтаварыстве дапамагай уцягненьню бяднячак і сераднячак у калгасы. Дапамагай арганізаваць іх на барацьбу з кулакамі.

На нашых вачох зараз праводзіцца вялікая сацыялістычная будоўля. Асноўныя масы сялянства, беднякі і сераднякі масамі ідуць у калгасы. Плошча зямлі пад калгасамі, якая нядаўна, усяго паўтара гады таму назад налічвала якіх-небудзь 2 проц., да ўсёй зямельнай плошчы ўжо зараз выросла да 20%, да ўсёй зямельнай плошчы і працягвае хутка ўзрастаць.

Ужо пятая частка сялянства ахоплена калгасамі і кожны дзень прыносіць звесткі аб новых сотнях і тысячах сялян, беднякоў, сераднякоў і батракоў, якія аб'яднаюцца ў калгасы. Асобныя раёны каляктывізаваны цалкам.

Апошні Пленум ЦК Камуністычнай партыі Беларусі паставіў перад партарганізацыяй і перад усёй рабочай клясай задачу правесьці суцэльную каляктывізацыю Беларусі ў 2-гадовы тэрмін.

Суцэльная каляктывізацыя нясе поўнае зьнішчэньне кулацкай гаспадаркі.

Кулак закляты вораг сацыялістычнай перабудовы вёскі і перашкаджае арганізацыі калгасаў усімі спосабамі. Ён запалохвае беднату і сераднякоў, нападае на актывістаў-батракоў і беднякоў, якія праводзяць агітацыю за калгасы, падпальвае іх будынкі і будынкі калгасаў, зьнішчае жывёлу, імкнецца скарыстаць адсталыя пласты бяднячак і сераднячак для зрыву каляктывізацыі.

Кулакі імкнуцца пралезьці ў калгасы, каб знутры падрываць там працу, яны агітуюць за разбазарываньне жывёлы і маёмасьці да ўваходу ў калгасы. Шалёная барацьба кулакоў супроць лініі партыі тлумачыцца тым, што яны адчуваюць сваю блізкую пагібель. Партыя выразна паставіла сваёй мэтай ліквідаваць кулацтва, як клясу.

Гэта патрабуе ўзмацненьня кіруючай ролі пралетарыяту ў калгасным руху, у справе наступленьня на кулацтва.

Зламаць супраціўленьне кулака, выгнаць яго з калгасаў, у якія ён мейсцамі пралез, дапамагчы арганізаваць працу ў калгасах, каб узьняць яе вытворчасьць, падрыхтаваць кадры кіраўнікоў калгасаў—гэта зараз зьяўляецца важнейшай задачай рабочай клясы.

Адным з відаў кіраўніцтва і дапамогі рабочае клясы, справай сацыялістычнай перабудовы вёсцы—зьяўляецца шэфства рабочых над вёскай.

Але дагэтуль шэфскія таварыствы, якія існуюць на фабрыках і заводах, у большасьці яшчэ не перабудавалі сваю працу так, каб яна адпавядала тым новым задачам уцягненьня асноўных мас сялянства ў калгасы.

Шэфскія таварыствы ў большасьці выпадкаў працавалі бесплянава, было шмат выпадкаў, калі сродкі шэфтаварыства выдаткаваліся немэтазгодна на падарункі асобным сялянам, шмат была парадных выездаў шэфаў, якія не давалі ніякай карысьці, у актыўную працу шэфтаварыстваў уцягвалася малая колькасьць рабочых.

Вядома, што такая праца зусім не адпавядае тым запатрабаваньням, якія маюцца ў сувязі з суцэльнай каляктывізацыяй.

Неабходна, каб шэфскія таварыствы паставілі перад сабой асноўную задачу дапамагчы ў справе каляктывізацыі.

Рабочыя набылі трыер для падшэфнага калгасу

Калі шэфы ўтрымліваюць хату-чытальню—яна павінна ўсю сваю працу накіраваць на садзейнічаньне каляктывізацыі; *калі шэфы арганізавалі ў вёсцы дэлегацкі сход жанчын, неабходна ўсю працу гэтага сходу пабудаваць так, каб ён дапамагаў каляктывізацыі, каб дэлегаткі першыя ўвайшлі-б у калгасы і ўцягвалі-б астатніх бяднячак і сераднячак.* На агітацыю за каляктывізацыю трэба накіраваць усю працу: даклады, спэктаклі, гутаркі, лекцыі правадзімыя шэфамі.

Неабходна ўцягнуць у працу шэфскіх таварыстваў самыя шырокія колы рабочых і работніц, якія павінны дапамагчы ў справе разгортваньня калгаснага будаўніцтва, у барацьбе з кулакамі, у гаспадарчым і культурным уздыме калгасаў, у абагуліваньні быту. На гэта трэба накіраваць усе выязды шэфаў і сродкі, якія маюцца.

Для арганізацыі культурна-бытавых устаноў неабходна прыцягнуць актыў і шырокія масы работніц, якія ўжо маюць вопыт арганізацыі такіх устаноў на фабрыках і заводах і змогуць дапамагчы сялянкам-калгасьніцам арганізаваць пляцоўкі, ясьлі, сталоўкі ў калгасах.

Зараз накіроўваецца для сталай працы ў калгасы першы атрад—500 перадавых рабочых і работніц—дабраахвотнікаў, якія памогуць бядняцка-серадняцкім пластам сялянства пад кіраўніцтвам партыі, будаваць моцныя калгасы і разьбіваць усе спробы кулакоў, якія імкнуцца разваліць і разбурыць калгасы.

Апошні Пленум ЦСПСБ у студзені месяцы гэтага году пастанавіў у гэтым годзе накіраваць яшчэ ня менш 500 рабочых для гэтай працы.

Неабходна, каб другі атрад перадавых рабочых і работніц быў навербаваны пераважна з тых, якія актыўна працуюць у шэфскіх таварыствах. Ужо зараз неабходна шэфскім таварыствам пачаць рыхтаваць гэтых таварышоў, уцягнуць іх у шэфскую працу, арганізаваць для іх гурткі, лекцыі, курсы аб працы на вёсцы.

Шэфскае таварыства павінна ўцягнуць актыўных работніц і рабочых, працуючых у вытворчых камісіях і нарадах у шэфскую працу з тым, каб яны дапамаглі арганізаваць вытворчыя камісіі і нарады ў калгасах.

За гэтую працу неабходна ўзяцца зараз-жа з тым, каб узмацненьне і перабудова шэфскіх таварыстваў „тварам да калгасу“ ўжо адчувалася-б у надыходзячай вясеньней гаспадарчай кампаніі.

Ні адна работніца не павінна стаяць у баку ад працы шэфтаварыства, у баку ад працы па сацыялістычнай перабудове вёскі.

Шапіра.

Згуртаванымі калёнамі—уперад.

„Толькі ў цеснай сям'і Савецкага Саюзу, толькі пры дапамозе пралетарыяту брацкіх сацыялістычных рэспублік БССР змагла і зможа ў далейшым з яшчэ большым тэмпам ісьці па шляху сацыялістычнага будаўніцтва“.

(З адозвы ЦК КП(б)Б да рабочых Чырвонага Сормава).

Марошак — работніца ф-кі „Акцябр“, якая паехала для працы ў калгас.

Завод Чырвонае Сормава, на якім працуе 21 тысяча рабочых і работніц, вылучыў 100 рабочых, якіх пасылае да нас у Беларусь, для практычнай дапамогі ў сацыялістычнай перабудове вёскі. Рабочыя Сормава ўзялі шэфства над Магілеўскай акругай, каб правесьці суцэльную калектывізацыю акругі.

Дэлегацыя сормаўцаў, якая была нядаўна ў Менску, зьвярнулася з адозвай да рабочых, работніц, бядняцкага і серадняцкага сялянства БССР.

У адозьве Сормаўцы заявілі: „Мы, дэлегаты, бачылі, якая вялізная праца праробліена партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі ў галіне перабудовы сельскае гаспадаркі, у галіне разьвіцьця калгаснага руху і пераканаліся ў тым, што беднота і серадняцкае сялянства сьвядома пераходзяць ад індывідуальнае гаспадаркі на больш буйное калектыўнае землякарыстаньне, на сацыялістычныя рэйкі. Гэта пацьвярджаюць лічбы, як факт—Магілеўская акруга калектывізавана на 48 проц. Не адстаюць і іншыя акругі.

Рабочая кляса Беларусі павінна безадкладна стаць на чале гэтага сьвядомага парыву бедняка і серадняка, павінна практычна, яшчэ больш, дапамагчы ім. Трэба зараз-жа рабочай клясе вылучыць з свайго асяродзішча клясава-вытрыманых пралетараў.

Сормавічы ў сваю чаргу пасылаюць на першы раз 100 таварышоў, якія з упэўненасьцю апраўдаюць давер'е рабочых нашага заводу і ім павінна быць аказана падтрыманьне з боку рабочых Беларусі. *Мы, дэлегаты, бярэм на сябе абавязак, як прыедзем у Сормава, паставіць пытаньне перад рабочымі аб узяцьці шэфства над аднэй з акруг Беларусі і гэтым дабіцца ў падшэфнай акрузе суцэльнае калектывізацыі і давядзем, што мы не на наперы, а на справе ўмеем выконваць рашэньні нашае партыі.*

Малкіна — работніца ф-кі „Акцябр“, якая паехала для працы ў калгас.

Таварышы рабочыя, перадайце нашу пралетарскую салідарнасьць бедняком і серадняком, што мы заўсёды, ва ўсякую мінуту, гатовы дапамагчы сялянству ў галіне перабудовы сельскае гаспадаркі.

Уперад, дарагія таварышы, да новых перамог на працоўным фронце, уперад, да хутчэйшай пабудовы сацыялізму у нашым краі, пад кіраўніцтвам кампартыі і яе ленінскага ЦК УсеКП(б)“.

„Павесьці рашучае наступленьне на кулацтва, зламаць яго супраціўленьне, ліквідаваць яго як клясу і замяніць яго вытворчасьць вытворчасьцю калгасаў і савгасаў“.

СТАЛІН.

Батрачкі, калгасьніцы, сялянкі, не давайце разбазарваць жывёлу.

У шэрагу мейсц, асабліва ў раёнах суцэльнай калектывізацыі назіраецца звышнармальны распродаж жывёлы бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі. Таксама значна павялічыўся ўбой жывёлы насельніцтвам для спажыванья.

Такое ненармальнае зьявішча магчыма тлумачыць толькі тым, што на мясцох не здавальняюча разгорнута праца па растлумачэньню насельніцтву ўсёй тэй шкоднасьці, якая робіцца самімі-ж бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі, якія нарачыта выкідаюць на рынак жывёлу, зьбіраючыся ісьці ў калгасы. Ня растлумачана, як належыць, неабходнасьць і карыснасьць для саміх-жа беднякоў і сераднякоў поўнай здачы ў калгас сваёй маемасьці.

Гэта неўсьведамленьне бядняцка-серадняцкіх мас выкарыстоўвае кулак у сваёй барацьбе супроць калгаснага руху.

Кулакі скарыстоўваюць усе сродкі, каб сарваць арганізацыю калгасаў: распускаць агідныя чуткі аб калгасах, даходзяць да тэрору—забойству актывістых, падпалу калгасаў. Зараз кулацтва імкнецца пашкодзіць яшчэ і такім шляхам.

Убачыўшы, што бядняцка-серадняцкія масы нельга запалохаць і стрымаць ад уступленьня ў калгас, кулакі мейсцамі пачалі агітаваць за ўваход беднякоў і сераднякоў у калгас, але без маемасьці, бяз сродкаў вытворчасьці: — „што вы вядзеце сваіх дохлых каровак у калгас! лепш прадавайце іх, а вам савецкая ўлада дасьць лепшых“.

Такія „парады“ часьцяком можна чуць на вёсцы.

Кулак добра разумее, што калі бядняцка-серадняцкія гаспадаркі будуць распрадаваць сваю маёмасьць, а ня ўносіць яе ў калгас, гэтым самым будзе паслабляцца эканамічная моц калгасу і магчымасьць найбольш хуткага гаспадарчага замацаваньня яго, а гэта якраз на карысьць кулаку.

Такой кулацкай контр-рэвалюцыйнай агітацыі ня было дано сваячасовага адпору. Праўда, у апошні час партыйныя арганізацыі правялі некаторую растлумачальную працу, яле яшчэ і зараз прыходзіцца чуць такія размовы некаторых беднякоў і асабліва сераднякоў: „Трэба прадаць кароўку і купіць боты, бо як гэта ісьці ў калгас у лапцёх“.

Кулацкая агітацыя, няведаньне тых парадкаў, якія існуюць у калгасах, выклікаюць тое, што некаторыя беднякі і сераднякі імкнуцца сябе застрахаваць: „Лепш—кажуць некаторыя сераднякі,—няхай будзе лішні рубель у кішэні, чым, прышоўшы ў калгас, ня быць гаспадаром над сваёй маёмасьцю“.

Кожная актывістка, — батрачка, калгасьніца, бяднячка і сераднячка павінна добра ўявіць сабе і растлумачыць беднаце і сераднякам усю шкоднасьць разбазарваньня жывёлы і іншай маёмасьці пры ўваходзе ў калгас.

Трэба шырока растлумачыць, што разбазарваньне жывёлы ідзе толькі на карысьць кулакам, якія, агітуючы за продаж жывёлы, самі-ж потым стараюцца яе скупліваць.

Мы ня маем яшчэ магчымасьці, каб адразу забясьпечыць усе калгасы трактарамі, пагэтаму неабходна, каб забясьпечыць калгасы цягавой сілай, весьці барацьбу супроць продажу ня толькі кароў, але і коняй.

Кожная бяднячка і сераднячка павінна ведаць, што чым больш будзе ўкладзена маёмасьці ў калгас самім насельніцтвам, тым хутчэй замацуецца калгас і палепшыцца эканамічнае становішча калгасьнікаў. *Дзяржава з свайго боку будзе рабіць большую дапамогу тым калгасам, якія зьбіраюць больш сваіх сродкаў, сябры якіх пры арганізацыі калгасу не прадавалі сваёй маёмасьці, а перадавалі ў калгас.*

Трэба шырока растлумачыць усім калгасьніцам, усім бяднячкам і сераднячкам, што маёмасьць, якая ўносіцца ў калгас, не адбіраецца, а залічваецца ў пай на ўклад тэй гаспадаркі, якая яе ўнесла.

Дойка кароў у калгасе.

Гэтая маёмасьць па ацэнцы, зробленай самімі-ж калгасьнікамі, будзе лічыцца на рахунку тэй гаспадаркі, якая ўнесла маёмасьць. *Праз сходы і групы беднаты, дэлегацкія сходы і агульныя бядняцка-серадняцкія сходы трэба тлумачыць з дня на дзень неабходнасьць ісьці ў калгасы з усёю маёмасьцю. Неабходна рашуча выкрываць і вясьці барацьбу з кулацкай агітацыяй.*

У адносінах да кулакоў, якія разбазарваюць жывёлу, трэба ўжываць суровыя меры: лішэньне зямлі, канфіскацыя жывёлы і прыцягненьне да судовай адказнасьці.

Неабходна дабівацца, каб самі калгасьнікі і калгасьніцы прымалі на сваіх сходах пастановы аб забароне сябрам калгасу прадаваць маёмасьць без дазволу праўленьня, а таксама адмаўляць у прыёме тым гаспадаркам, якія прадаюць, альбо рэжуць сваю жывёлу.

З мэтай найбольш хуткага разьвіцьця і палепшаньня жывёлагадоўлі патрэбна дабівацца паскарэньня абагульваньня жывёлы ў калгасах. Ва ўнаў арганізуемых калгасах магчыма для агульнага хлява скарыстаць лепшыя пуні калгасьнікаў, можна сабраць корм і яшчэ да вясны абагуліць стада. Калгасьніцы павінны дабівацца палепшаньня догляду за жывёлай і пашырэньня гадоўлі маладняка ў калгасах.

Н.

Працаваць па-новаму.

(Запалкавая фабрыка, Гомель).

Работніцы на фабрыцы „Везувій“ складаюць асноўную масу на вытворчасьці, іх зараз працуе звыш тысячы.

У адным толькі зьёмачным цэху працуе каля 700 работніц. На зьёмцы побач з караннымі работніцамі працуе значны лік работніц з вёскі. Таму ў гэтым цэху магчыма пачуць ад некаторых работніц такія разважаньні:

— Якая гэта карысьць ад ударных брыгад, мы і бяз брыгады ня кепска працуем.

Што такія думкі не адзінічныя, сьведчыць тое, што ва ўдарныя брыгады вайшла толькі палова работніц зьёмкі.

Фабрыка „Чырвоны тэкстыльшчык“—гутарка ў цэху.

Але некаторыя вынікі сацспаборніцтва ўжо маюцца: узьнялася працоўная дысцыпліна, браку стала менш. З брыгадамі праводзяцца нарады, як надалей палепшыць справу сацспаборніцтва.

* * *

Злобай дня ў каробачным цэху зьяўляецца пераход на тры варштаты па ўнутраным каробкам. Аб гэтам гавораць зараз работніцы, ячэйка, цэхавая адміністрацыя, аб гэтым крычыць насьценгазэта.

Ужо больш месяца група работніц у парадку сацыялістычнага спаборніцтва ўзьняла пытаньне аб тым, каб у мэтах рацыяналізацыі працы паставіць двух работніц на 3 варштаты.

Гэта прапанова выклікала нездавальненьні некаторых работніц. Насьмешкі пасыпаліся на зачыншчыц рацыяналізацыі. Былі выпадкі, калі некаторыя адсталыя работніцы злосна перашкаджалі працы ўдарніц. Некаторыя не ўстаялі, кінулі, перайшлі на старыя мэтады работы.

Але засталася стойкая група, якая ўпарта дабівалася сваёй мэты.

Такіх—14. Яны не баяліся насьмешак—усімі мерамі імкнуцца пераканаць у сваёй праваце.

Гэта каштоўная ініцыятыва работніц пакуль ня сустрэла належнага падтрыманьня з боку адміністрацыі фабрыкі, якая недаверліва качае галавой: а калі брак павысіцца? Але пакуль ніхто не пакланаціўся падлічыць, што дасьць гэтая рацыяналізацыя, прыбытак альбо страту.

Зразумела, што з пачатку можа будзе і больш браку, бо пры рацыяналізацыі, пакуль не набудуцца навыкі, могуць быць часовыя страты.

* * *

Агромная маса работніц у вытворчасьці патрабуюць вялікай выхаваўчай работы. А што мы маем?

На фабрыцы каля 300 няпісьменных работніц, і ня ўсе ахоплены вучобай. Ужо на сёньня каля 80 работніц адсеялася ад ліквпункту. А з навучаньнем на даму справа не наладжана. На курсах па падрыхтоўцы рабочых у ВУЗ'ы, якія існуюць пры фабрыцы зусім мала работніц.

Антысэмітызм цэпка трымаецца на фабрыцы, слова „жыд“ ня рэдка магчыма ўслышаць. Часьценька і нараканьні, як быццам, яўрэям лепшую работу даюць.

Сталай работы па інтэрнацыянальнаму выхаваньню не вядзецца.

Пачаўшаяся на фабрыцы партчыстка яскрава паказывае, што самакрытыка на фабрыцы зусім слаба разгорнута; таму магчымы былі такія факты, як п'янства, змазыванье шэрагу хваравітых момантаў у парт'ячэйцы ўпаковачнага цэху, што ўскрылася толькі ў час чысткі.

Слабы прыток работніц у партыю, напрыклад, у аснаўным жэнскім цэху—зьёмкі з 700 работніц толькі 50 сябраў партыі.

Ня гледзячы на такое нездавальняючае становішча выхаваўчай работы на фабрыцы, парткаляктыў працы сярод жанчын не ўдзяляе належнай увагі. Жанарганізатар—работніца выпучэнка ня атрымлівае ні адкуль дапамогі.

Неабходны рашучы пералом у гэтай справе.

А-ская.

Разгортваем дашкольны паход.

Дашкольны паход у Віцебску пачаўся спачатку лістапада. Па ўсім рабочым клюбам былі зроблены даклады аб задачах дашкольнага паходу. Арганізавалі ў Доме Працы сьвята для бацькоў з прадстаўнікамі ад прадпрыемств. Выпушчаны лёзунгі з заклікам да ўсіх працоўных удзельнічаць у паходзе. Па дзіцячым садам прапрацоўваецца пытаньне аб удзеле дзяцей у паходзе.

Зараз вылучаны штаб паходу. Для палепшаньня выхаваўчай работы сярод дзяцей арганізаваны курсы для матак на 100 чалавек. З гэтага ліку 50 асоб вылучаны Жактамі з жаночага актыву.

За гэты час у справе паходу маюцца ўжо практычныя вынікі: адчынены два дзіцячыя вячэрнія пакоі пры другім дзіцячым садзе і 1-м дзіцячым ачагу, разам з калякцывам працаўнікоў 5-й школы, апошняя будзе абслугоўваць дзяцей, маткі якіх навучаюцца ў ліквпунктах.

Пры Жакце № 9 з першага студзеня адчыняецца дзіцячы сад а другі дзетсад арганізуецца пры Жакце № 6.

Удзел спажывецкай кааперацыі выяўляецца ў тым, што на сродкі кааперацыі арганізуецца 3 дзіцячых сады ў калгасах.

г. Віцебск. **Дашкольніца.**

Выхаваўчую работу перабудаваць!

Адзінкі перагружаны, аснаўная маса—адсталая, ня ўцягнута ў грамадзкую работу. Праграма вучобы не прыстасавана да паліт-узроўню камунарак. Няма паручыцеляў, Райком не паклапоціўся прымацаваць партыйцаў для вывучэння і дачы рэкамэндацыі ў партыю камунаркам.

Не пад сілу.

Пяро лёганькае. Вы нават ня адчуваеце, калі вам на плячо ляжа пушынка. А вярблюд—моцная жывёліна. Але пра тое самае пяро і вярблюда гавораць так: „Кладзіце на вярблюда па аднаму пяру, і ўсё-ж будзе тая пярынка, якая паламае яму сьпіну. Сьпіна вярблюда—гэтай выносьлівай жывёліны, стрымае толькі вядомую колькасьць цяжару пяра.

Вядома, вагу мае ня толькі пяро, а грузяць ня толькі на сьпіну: грузяць і на галаву і нагрузка бывае розная.

Нагрузка правільная, умеру—разьвівае чалавека. А вось такая нагрузка, як у камуне „Бальшавік“ можа паламаць мазгі.

У савеце камуны „Бальшавік“ 5 асоб, з іх 2 камунаркі, абедзьве яны на актыўнай рабоце: скарбнік і сакратар камуны. Ёсьць камунарка ў рэвізыйнай камісіі, сябра кіраўніцтва каапэрацыі, на рабоце у Мопры, у Асаавіяхіме.

Здаецца зусім добрая справа: камунаркі ўцягнуты ва ўсе галіны работы як кіруючай, так і грамадзкіх арганізацый. Але разгледзім работу аднэй з гэтых камунарак.

Возьмём к прыкладу Зосю Адамовіч.

Зося сама і бацькі яе батрачылі ўвесь свой век. Таму рукі Зосі прывыклі к мазалям, а грамаце вучыцца было некалі. Пяты год Зося ў камуне. Расьце, мацнее гаспадарка камуны. Расьце, разьвіваецца Зося.

Батрачак партыя кліча ў свае шэрагі. Зося падала заяву аб уступленьні ў партыю.

Камуністы павінен быць прыкладным на вытворчасьці, на гаспадарцы, у грамадзкай рабоце. Зося ўвесь час выконвае грамадзкую працу. Але сёньняшняя нагрузка не па сілам ня толькі Зосі, а нават і тым, хто там разьмяркоўвае працу. Зосіна нагрузка паламала-б сьпіну.

Пералічым.

Зося ліквідуе сваю няпісьменнасьць, наведвае паліт-гурток, тая-ж Зося-дэлегатка, сябра савету камуны, скарбнік і прымацаваны да КСУ. Калі дадаць к гэтаму тое, што гэтай камунарцы трэба быць прыкладнай на працы ў гаспадарцы, дагледзець сям'ю (быт у камуне яшчэ не арганізаваны, няма ясьляў і агульнага харчаваньня), то стане зразумелым нагрузка Зосі.

Сама-ж Зося памятае, што ад яе патрабуюць прыкладнасьці, ад працы не адмаўляецца, цягне яе, зьверх сілы, да адурэньня.

А кіраўнікі грузяць новую і новую працу.

Чаму-ж такое становішча? Можа ў камуне „Бальшавік“ усе так нагружаны?

Зусім не. Грамадзкую нагрузку маюць адзінкі. Асноўная-ж маса камунарак у работу ня ўцягнуты, не актыўны. На сходзе ад іх не выцягнеш слова.

Такое разьмеркаваньне працы не дае магчымасьці расьці масе камунарак, глушыць здольных працаваць.

Зубы паламаем.

У часе чысткі партыі разам з Зосяю падалі заявы аб уступленьні ў шэрагі КП(б)Б цэлая група лепшых камунараў і камунарак.

Трэба вучыцца—сказала партячэйка.

Арганізавалі паліт-гурток. Веды не ва ўсіх адналькавыя. Гурток адзін. У гуртку праходзяць „Азбуку Ленінізму“ (для гарадзкіх школ). Усе праходзяць. Але-ж?

Адны на занятках—як рыба ў вадзе. А вось тыя, як Зося, што толькі ліквідуюць сваю няпісьменнасьць, ім ніяк не ўмяшчаецца ў галаву такі падручнік.

— Цяжка. Зубы зламаеш. Ніяк я не магу зразумець, а ня толькі запамятаць. Хоць-бы адну старонку задалі, вывучыла-б як небудзь, а то гутарка—цэлых 15 старонак. Не магу. Мабыць ня здольная я—заяўляе камунарка.

Не камунарка няздольная, а кіраўнікі, якія прымушаюць няпісьменных грызьці такую „Азбуку“.

Праграму вучобы трэба прыстасаваць да слухачоў, улічыўшы іх палітычны і агульны ўзровень.

Трэба перабудаваць палітыка-выхаваўчую работу ў камуне „Бальшавік“, а таксама разьмеркаваньне грамадзкай нагрузкі. Бо пры маючыхся парадках колькі-б не пацелі камунары і камунаркі, усё-ж не асіляць яны „Азбукі“ і такой „нагрузкі“. А не асіліўшы, адхіляюцца ад яе.

Яшчэ адна перашкода для ўступленьня ў партыю камунарак—паручыцельствы.

У ячэйцы камуны адзін сакратар ячэйкі мае права даваць рэкамэндацыі, у астатніх малы стаж. Таму заявы камунарак доўга ляжаць у ячэйцы, прыняць нельга, няма рэкамэндуючых.

Райком не клапоціцца аб гэтым. Сакратар Райкому толькі па інфармацыям ведае камуну, сам ён н разу ня быў там.

Трэба Райкому паклапаціцца, прымацаваць партыйцаў да камуны, якія-б вывучылі камунараў, падаўшых заявы ў партыю, далі рэкамэндацыі. Трэба Райкому зацікавіцца выхаваньнем, вучобай і разьмеркаваньнем грамадзкай працы сярод камунараў.

Сярод камунарак самакрытыкі не адчуваецца.

— „Усё добра. Вучымся, працуем“.

Пастаноўку вучобы і працы лічаць нармальнай, як і іншае, аб чым мы пагаворым у наступны раз, калі будзем разглядаць быт камунарак і падрыхтоўку кадраў.

Самахвалавіцкі раён

В. Х.

Рэдакцыя чакае водгукаў ад работніц, батрачак, савгасьніц і калгасьніц аб тым, як у вас пастаўлена выхаваньне для ўступленьня ў партыю. Пішэце, як справа з вучобай, грамадзкай работай.

Гутарка з дэлегаткамі

Сёньні гутарка аб арганізацыі працы і быту калгасьніц і таму шмат пытаньняў задавалі і ў спрэчках выступалі дэлегаткі.

— Добра культурна-бытавая камісія зрабіла, што паклапацілася аб дзецях: усіх у школу выправіла, адзеньне і абутак далі.

А вось нам, дык кепска: летам на полі столькі работы было і то ўпраўляліся, а зараз хто яго ведае, скуль тая праца плыве. Запісаліся ў лікпункт некаторыя, а наведваюць ня ўсе: дзеці, памыць, зварыць—усё трэба—кажа Гэля.

— Улетку ў нас яслі былі, па чарзе яду варылі, таму і ў гаспадарцы працавалі больш і ўпраўляліся лепш. А зараз як спынілі работу яслі, як стала, па сканчаньню палявых работ, кожная паасобку варыць, дык і часу няма—заўважыла Мар'я.

— Правідлова кажа Мар'я—адказаў кіраўнік дэлегацкага сходу. Каб ляпей быў быт наш арганізаван, дык і праца жанчын больш карысьці давала-б.

Зараз нам патрэбна, каб наша гаспадарка ня толькі паляводзтва разьвівала, але і іншыя галіны, асабліва жывёлагадоўлю, гародніцтва, птушніцтва, сыраварэньне, садаводзтва, а тут—шмат працы для жаночых рук.

Год ужо як мы працуем агульна і вы самі бачыце, што гаспадарка наша за гэты час значна палепшылася. Але гэтага яшчэ мала. Мы можам значна ляпей паставіць нашу гаспадарку, калі будзем больш працаваць і калі нашу працу правільна арганізуем. Будзем больш працаваць, зато яшчэ ляпей жыць будзем, таму што сумеем правільна нашу гаспадарку паставіць і вытворчасьць працы ў нашым каляктыве падняць.

Узяць хаця-б жывёлагадоўлю, трэба нам больш правільны догляд за жывёлай устанавіць, тады больш малака будзем мець і сыраварню пашырыць магчыма будзе. Маладняку больш гадаваць патрэбна. Адкорм сьвіней у нас яшчэ кепска пастаўлены, а сьвінаводзтва дае карысьць вялікую для гаспадаркі.

Усю гэту працу ў першую чаргу жанчыны павінны рабіць, таму ад вас саміх залежыць палепшыць сваю працу і жыцьцё, трэба, каб праўленьне разьмеркавала ўсю працу так, каб усе жанчыны былі ў гаспадарцы на працы заняты.

— А чаму-ж жанчынам плацяць менш, чым мужчынам? Пастанова была, каб за роўную працу роўна плаціць—запытала Марына.

— А вось ты сама палічы: твой муж па 8—9 гадзін у дзень працуе, а ты на дзьве—тры гадзіны пазьней ідзеш, бо зранку ў печцы, ды з дзіцём возішся. Ну і праца яго больш карысная, бо ён на машынах працаваць можа—ён і сыраварняй кіруе.

— Трэба, каб і жанчына магла на машынах працаваць, ды гаспадаркай кіраваць — запатрабавала Мар'я.

— А вось чаму на курсы трактарыстых нікога з жанчын не паслалі? каб падвучылася, дык і жанчына змагла-б усякую работу рабіць—загулі дэлегаткі.

— Вось давайце і абгаворым як ляпей працу жанчын у калгасе наладзіць—прапанаваў кіраўнік.

— Уносьце самі прапановы!

— Першае—яслі нам патрэбны сталыя, калі будуць яслі, больш часу і для работы ў гаспадарцы будзе і для вучобы.

— Агульнае харчаваньне мы таксама наладзіць зможам: хлеба і гародніны хапае, ды і сьвіней падгадуем.

— Ну калі ў нас хатнія справы перашкаджаць ня будуць, дык у гаспадарцы таксама ляпей трэба працаваць.

— Хутка пры акруговым калгас-саюзе курсы вытворчыя адчыняюцца. Трэба абавязкова паслаць жанчын, каб і яны кваліфікацыю мелі.

— Але-ж усе на курсы не паедуць, трэба гурток сельска-гаспадарчы наведваць і агранома запрасіць.

Так і парашыў сход вынесьці такую пастанову:

1. Арганізаваць у калгасе сталыя дзіцячыя яслі, агульнымі сіламі бялізну пашыць, а адну з дэлегатак паслаць на курсы загадчыка яслямі.

2. Зарганізаваць да вясны агульную сталоўку.

3. У акругу на курсы, што будуць адчыняцца, паслаць дэлегатак вучыцца на сыравараў, трактарыстых, паварoў і іншыя.

4. Сельска-гаспадарчы гурток усім наведваць.

5. Прымацаваць да загадчыка жывёльным дваром і сыраварні—дэлегатак, каб іх падвучылі.

6. Навучыць жанчын на машынах працаваць, прымацаваць калгасьніц да розных машын (жнейка, касарка і інш.).

Н.

Пухавічы рапартуюць.

(Што зроблена па Пухавіцкаму раёну для выкананьня саюдагавору на жанработу).

1. Высунута работніца і батрачка на каапэрацыйныя курсы, адна батрачка на саюзныя курсы і адна на каапэрацыйную працу.

2. Дэлегацкімі сходамі рэалізавана 3 пазыкі на суму—323 руб.

3. У касу ашчаднасьці завярбована 56 укладчыкаў на суму 727 руб.

4. Сабрана мяшкоў праз дэлегацкія сходы—953.

5. Выпісваем часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка" 469 экзэмпляраў.

6. Праведзены батрацкія курсы, дзе было 14 батрачак з іх 9 чалавек падалі заявы ў КП(б)Б.

7. Арганізаваны чырвоны жаночы абоз, які здаў 618 кгр. ільну і 858 кгр. лому жалеза. Лому жалеза здалі праз дэлегацкія сходы 1.044 кгр.

8. Арганізаваны жаночы чырвоны абоз, які здаў 8000 кгр. бульбы звыш вызначанай нормы.

9. На лікпункце па-нашаму раёну вучыцца 2.042 жанчыны.

Рэдакцыя чакае, што зроблена дэлегаткамі па калектывізацыі.

Чаму дзіцяці патрэбны гульні*)

Часьцяком дарослыя папракаюць малышоў: „Ай, які ты надаедлівы. Пасядзі спакойна. Усё пад нагамі круцішся, усё табе трэба чапаць. Гэта табе не цацка".

Так увесь дзень клапатліва рухаецца дзіця. А дарослыя вельмі часта не разумеюць, чаму дзіця так рухава, якую вялізарную значнасьць мае для дзіцяці рухавасьць.

Дзіця расьце, разьвіваецца. Рост яго залежыць ня толькі ад харчаваньня. Справа ў тым, што страва ператвараецца у кроў, а кроў цячэ па ўсяму целу, стравуе яго. Чым больш рухаецца дзіця, тым шпарчэй цячэ кроў, а такім чынам і больш страваваньня атрымоўвае цела. Без рухаў страва пераварываецца кепска, дзіця слабее, робіцца блядым.

Таму бацькі павінны самі клапаціцца, каб дзіця было рухавым, даваць магчымасьць для яго гульняў.

У гульнях дзіця разумнее. Многае, што акружае дзіця, для яго незразумела, нова і цікава. Усім вядомы частыя пытаньні дзіцяці: „Чаго, чаму, навошта". Дзіцёнак не здавальняецца адказам дарослых, яму патрэбна самому агледзіць розныя рэчы, памацаць, даведацца. Гуляючы дзіця распазнае ўласьцівасьці гэтых рэчаў: што з іх можна зрабіць, як скарыстаць. Гуляючы з паперай, дзіця рве яе, мне, піша; гуляючы з дрэвам, дзіця даведваецца, што дрэва цьвёрдае, не разьбіваецца. Гуляючы, дзіця

Змалагодку прывыкаюць працаваць.

навучаецца само майстраваць цацкі, прывыкае думаць, як пабудаваць, такім чынам разьвівае мозг.

Гульні дапамагаюць дзіцяці зразумець акружаючае. У гульнях дзіця пераймае тое, што бачыла. Напрыклад: паявіўся ў горадзе трамвай, дзеці ўзяліся за рукі, губы дудачкай выцягнулі, гудуць, гуляюць у кандуктароў, машыністаў. Часта дзеці гуляюць у піонэраў, у сходы, у школу і гэтак далей. З гэтага мы можам ведаць, якое вялікае значэньне для

У дзіцячым садзе.

дзяцей мае прыклад акружаючага, але аб гэтым больш падрабязна пагаворым у наступны раз.

Так мы ведаем, што рухавасьць для дзіцяці неабходна. Гуляючы ў перагонкі, пераскакваючы праз вяровачкі, дошкі, хапаючы мячык, бегаючы за абручом дзеці набываюць спрытнасьць, робяцца гібкімі, здаровымі. Гуляючы з таварышамі, дзіця прывыкае лічыцца з імі, стрымліваць сябе—гэта выхоўвае ў дзіцяці каляктыўныя навыкі. Зрабіўшыся дарослым—такое дзіця будзе імкнуцца працаваць у каляктыве з другімі. Дзіця, знаходзячаяся не адно, а сярод многіх дзяцей, ня будзе распусным, злым, замкненым, забітым, падаўленым.

Сярод раўных сабе дзяцей, сярод таварышоў дзеці прывыкаюць быць дысцыплінаванымі, учынкі свае падпарадкуюць не сваім капрызам, не з баязьні перад дарослымі, а усьвядоміўшы неабходнасьць гэтага.

Зразумеўшы значнасьць гульняў для разьвіцьця і аздараўленьня дзіцяці, бацькам трэба паклапіцца стварыць умовы для гэтага, даць мейсца, неабходныя цацкі. У мінулай гутарцы мы ўжо гаварылі аб тым, што, ня даўшы цацак дзіцяці, яно пачне само шукаць іх, папсуе патрэбныя рэчы. А бывае, што у адшуканьні цацак дзіця лезе ў сьмяцьцё, дзе ня рэдка заражаецца ці калечыцца.

Самыя просьценькія цацкі дапамагаюць дзіцёнку разьвівацца, рухацца, будаваць, тварыць. Трэба клапаціцца, каб цацкі былі чыстымі.

Гатовыя цацкі ніколі не здаволяць так дзіця як зробленыя яго-ж, дзіцячымі рукамі, ці пры дапамозе дарослых. Змайстраваная такім чынам цацка, больш зразумелая для дзіцяці, больш каштоўная, бо над ею ён сам папрацаваў.

Трэба паклапаціцца, каб гульні дзіцячыя адбываліся ня ў цёмным кутку, а там, дзе больш сьвету, дзе больш паветра.

М. Мінкіна.

---

*) У Менску пры магазыне „Маць і Дзіця" арганізавана кансультацыя, для бацькоў, там кожная маці можа даведацца, якая цацка найбольш карысна для дзіцяці.

ПАРАДЫ АГРАНОМА

Выканаем з правышэньнем.

У зьвязку з разгарнутым шырокім рухам бядняцка-серадняцкага сялянства ў калгасы, пасеўкампанія бягучага году будзе праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы на вёсцы. Кулак і падкулачнік выкарыстоўвае ўсякія спосабы барацьбы супроць каляктывізацыі і іншых мерапрыемств савецкай улады па ўздыму сельскай гаспадаркі і палепшаньню дабрабыту бядняцка-серадняцкага сялянства. Вось чаму пасеўкампанія гэтага году набывае вельмі вялікае ня толькі гаспадарчае, але і палітычнае значэньне.

Жаночыя дэлегацкія сходы, жаночы актыў вёскі павінен ня толькі ведаць задачы, пастаўленыя ўладай і камуністычнай партыяй перад пасеўкампаніяй бягучага году. Яны павінны пляны пасеўкампаніі

Рамантуюць трактар.

сваіх раёнаў прапрацаваць на сходах, вытворчых нарадах і вызначыць, што яны павінны рабіць па ажыцьцяўленьню гэтых планаў.

Пастаўленая ўладай задача на ўцягненьне ў калгасы ў бягучую пасеўкампанію ня менш 35 проц. бядняцка-серадняцкіх двароў Беларусі павінна быць выканана.

Найбольш адказная задача выпадае на долю жанчын тых раёнаў, якія вызначаны да суцэльнай каляктывізацыі. Усе бядняцка-серадняцкія гаспадаркі Магілеўскае акругі і 15 раёнаў іншых акруг павінны быць цалкам каляктывізаваны да канца бягучага году.

Што гэта нам пасільна, можна бачыць з таго, што ўжо да першага студзеня аб'ядналася ў калгасы па ўсёй БССР больш 20 проц. бядняцка-серадняцкіх двароў. Ёсьць паасобныя сельсаветы і нават цэлыя раёны, каляктывізацыя якіх ужо скончана поўнасьцю.

Пашырым пасеўную плошчу.

Разам з пашырэньнем каляктывізацыі неабходна імкнуцца да таго, каб пасеўная плошча ў бягучым годзе была магчыма больш пашырана. Ня толькі межы, непатрэбныя сьцежкі, хмызьняк, рознага роду кусьцікі—павінны быць узараны. Пашырэньне пасеўных плошчаў павінна таксама ісьці за кошт магчыма большага скарачэньня незанятага папару, ялавін і г. д.

200 тысяч гэктараў дадатковага яравога пасеву, вызначаных па пляну НКЗ, трэба вышукаць і заданьне гэта неабходна выканаць цалком.

Забясьпечымся насеньнем.

Каб не застацца на вясну бяз насеньня, трэба зараз-жа, як толькі будзе арганізаваны калгас, стварыць насенныя фонды, ссыпаць гэта насеньне ў агульныя склады.

Пры зборы насеньня трэба захоўваць клясавы падыход да кожнай гаспадаркі, улічваць, што яна мае. Гаспадаркі, якія ў мінулым годзе засявалі большую плошчу і маюць адносна больш пасеву на аднаго едака, павінны даваць і больш насеньня. Пры аднолькавай плошчы пасеву, павінны даваць больш насеньня тыя гаспадаркі, якія маюць менш едакоў.

Павялічым ураджайнасьць.

Ураджайнасьць палёў у бягучым годзе трэба павысіць у савецкіх гаспадарках ня менш 30 проц., каляктыўных—25 проц. і паасобных сялянскіх—20 проц., у параўнаньні з ураджаем 1928 году. Для гэтага трэба лепш і сваячасова апрацаваць глебу, павялічыць штучнае ўгнаеньне, сабраць увесь попел на ўгнаеньне, завапнаваць, дзе гэтага патрабуе глеба, па магчымасьці больш прапускаючы торпу праз жывёльны двор і ўжыць на ўгнаеньне. Глеба павінна засявацца выключна ачышчаным і пратручаным перад пасевам насеньнем. Абмяняць у калгасе, савгасе, ці крэдыт. т-ве сваё звычайнае насеньне на сартавое, увесьці шматпалёвыя севазвароты і г. д.

Толькі пры ўдзеле жанчыны магчыма цалкам ажыцьцявіць усе гэтыя мерапрыемствы і дабіцца найбольшага паьышэньня ўраджайнасьці.

Увага жывёлагадоўлі.

Ва ўмовах Беларусі падвышэньне ўраджайнасьці палёў і павялічэньне вытворчасьці сельскае гаспадаркі неразрыўна зьвязана з жывёлагадоўляй.

Жывёла дапамагае лепш скарыстаць зьбіраемы з палёў ураджай, асабліва грубыя кармы—сена і салому, яна дае вельмі каштоўныя прадукты спажываньня: малако, мяса, сала, воўну і інш., а гной, атрымоўваемы ад жывёлы, ёсьць угнаеньне палёў.

Для палепшаньня якасьці жывёлы ў бягучым годзе арганізоўваецца шмат буйных племяных савецкіх і каляктыўных гаспадарак. Значна пашыраецца сетка злучных пунктаў з чыстапароднымі вытворнікамі і прымаюцца належныя меры да пашырэньня і палепшаньня кармавое базы, пашырэньня плошчы пад кармавыя травы і кораньплоды, палепшаньня сенажаці, пабудовы сіласных ям і башань і інш.

Для павялічэньня колькасьці жывёлы, неабходна спыніць значнае разбазарваньне жывёлы, скараціць выбракоўку яе і гадаваць увесь маладняк.

Трэба памятаць, што ад узмацненьня жывёлагадоўлі, павялічэньня прадукцыйнасьці жывёлы—залежыць дабрабыт нашае сельскае гаспадаркі, а разам з тым дабрабыт працоўных мас.

Усе на дапамогу пасеўкампаніі, усе на дапамогу жывёлагадоўлі.

Аграном **Туркін.**

Карыстайцеся зімою паветрам.

У летні час усе сьпяшаць карыстацца сьвежым паветрам. А вось, як толькі зьнізіцца тэмпэратура, як толькі падзьме халодны вецер, хаваюцца ў свае хаты, адзяваюцца ў цёплую вопратку і большую частку дню праводзяць у душных памяшканьнях. Узімку многія баяцца праветрываць пакоі, нават адчыніць фортачку на 10—15 хвілін і часта магчыма сустрэць кватэры, дзе форткі зусім не адчыняюць і памяшканьне не праветрываецца.

Людзі, якія жывуць у такіх памяшканьнях, хутка страчваюць бадзёрасьць, працаздольнасьць, якая маецца ў здаровага, пачынаюць хварэць. У пакоях, дзе мала паветра, хутка зьбіраецца ўглекіслата, якая атрымліваецца ад дыханьня людзей, ад копаці ламп і ад пячэй.

Некаторыя сем'і амаль на працягу 6 месяцаў знаходзяцца бяз чыстага паветра. Лёгкія ўбіраюць атручаную іспарэньнямі чалавечага цела і копаці паветра і гэта атручаная паветра разбураюча ўплывае на кроў і ўвесь арганізм чалавека, што садзейнічае хуткаму разбурэньню цела.

Калі дарослыя яшчэ як кольвек карыстаюцца ўзімку паветрам, то маленькія дзеці, асабліва на вёсцы на працягу ўсей зімы—зусім пазбаўлены сьвежага паветра. Такія дзеці хутка робяцца кволымі, ледзь папраўляюцца ўлетку. Вінавата ў гэтым базьнь прастудзіць.

Якое паветра неабходна нашым лёгкім, нашай крыві?

Толькі такое, якое насыщчана кіслародам, а гэтага кіслароду многа ў сьвежым паветры, таму баязьнь халоднага паветра зьяўляецца няправільнай. Наадварот, паветра зімою вельмі чыстае, у ім няма бацылы—гэта значыць узбудзіцеля розных хвароб. Такім чынам, сьвежае паветра зьяўляецца сродкам барацьбы з сухотамі.

Хворых сухотамі часьцяком пасылаюць для лячэньня ня толькі на поўдзень, але і на поўнач.

Зімовае паветра ўзмацняе здароўе чалавека, паляпшаецца праца лёгкіх і сэрца.

Таму трэба дзяцей выносіць на паветра пры ўсякім надвор'і. Трэба толькі дзіця цёпла апрануць, але не занадта кутаць. Трэба сачыць за тым, каб дзіця дыхала носам, зачыніўшы рот, бо дзіця, якое дыхае ротам, часта хварэе. Наш нос як праз фільтр затрымоўвае пыл і мікробы, а таксама грэе халоднае паветра.



Таму, каб выхаваць здаровую зьмену, усе работніцы і працоўныя сялянкі павінны клапаціцца аб тым, каб даць магчымасьць дзецям больш бываць на сьвежым паветры. Яны павінны клапаціцца аб тым, каб і памяшканьня ўтрымліваліся ў чыстаце і праветрываліся. Таксама трэба больш уцягнуць работніц, жонак рабочых і працоўных сялянак, асабліва дзяўчат у зімовы спорт.

Доктар **Нэйфах**.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА.

М. Піскун—Прысланыя вамі парады мы ўжо друкавалі ў часопісі раней.

Таршыс—Аб гуртку кройкі і шыцьця напішыце ў насьценгазэту.

Блешчык.—Аб зборы мяшкоў спазьнілася. пішыце аб падрыхтоўцы да пасяўной кампаніі і аб працы дэлегацкіх сходаў.

Блешчык—Аб самаабкладаньні спазьнілася.

Шлапак А. Ц—„За новае жыцьцё"—ня пойдзе, пішыце як працуе калгас „Новы Шлях".

Вока—„Дапамога з боку жанчын"—агульныя разважаньні, дайце факты ўдзелу жанчын у каляктывізацыі.

Хмялеўскай А.—Заметка ня пойдзе, агульнага зьместу, пішыце лепш, як удзельнічаюць сялянкі у каляктывізацыі вашага раёну.

Цітоўцы—Пішыце, як праводзіцца ў жыцьцё рэзалюцыя сходу, аб удзеле працоўных жанчын у каляктывізацыі.

Піскун—Напішыце, як удзельнічалі сялянкі ў перавыбары КСУ у вашай вёсцы.

Кілесса—Аб каляктыўным гародзе мы ўжо друкавалі. Пішыце аб тым, як бяднячкі і серадняцкі імкнуцца да арганізацыі ў калгасы.

Каваленка—Пішыце, як грамадчыцы выконваюць узятыя на нарадзе абавязкі.

Капусьцінскай—Пішыце больш падрабязна аб пастаноўцы працы школы і дзіцячага саду.

Беменко—Пастанову працоўных жанчын аб здачы царквы, сінагогі і касьцёлу пад культасьветныя ўстановы мы ўжо друкавалі ў часопісі.

Пішыце, як працоўныя жанчыны ліквідуюць сваю няпісьменнасьць. Пішыце, як дэлегаткі ўдзельнічаюць у каляктывізацыі, аб працы і быту калгасьніц і савгасьніц.

Хазан.—У допісу аб жонках рабочых вы ўзялі многа момантаў працы, таму ніводзін з іх нераспрацаваны дастаткова.

Рэдакцыя просіць вас напісаць подрабязна аб якім-небудзь адным моманце, напрыклад: вывучыце, як арганізавана ліквідацыя няпісьменнасьці сярод жонак рабочых, як уцягвалі ў гэту справу, колькі чалавек ахоплена, ці ёсьць дзіцячы пакой пры лікпункце і кім ён арганізаваны, як пасьпяваюць ліквідуючыя няпісьменнасьць, ці забясьпечаны падручнікамі і вучэбнымі прыладамі.

Маханоўскай.—Пішыце, як дэлегацкім сходам выконваецца вынесеная пастанова аб грамадзкай працы, у чым выяўляецца іх удзел у каляктывізацыі.

Рабкорскі пішуць

МЫ ЗА ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЮ КРАІНЫ, ЗА КУЛЬТУРНЫ РОСТ СССР.
МЫ СУПРОЦЬ РЭЛІГІЙНАГА ДУРМАНУ.

Каштоўныя рэчы ў фонд індустрыялізацыі.

Крыжы і падсьвечнікі ў фонд індустрыялізацыі.

Жонкі рабочых вагонных майстэрань у першых шэрагах.

За апошні час па пачыну работніц і жонак рабочых Шчацінай фабрыкі пачаўся шырокі рух па здачы каштоўных рэчаў: золата, срэбра ў фонд індустрыялізацыі. Уздым нябывалы. На Шчаціннай фабрыцы пакуль сабрана: 8 залатых пярсьней і некалькі пар завушніц. У арцелі Сампрамкаапэрацыі сабрана ўжа многа каштоўных рэчаў: залатых пярсьней, завушніц, срэбных чарак, лыжак, падсьвечнікаў.

У першых шэрагах энтузіастых ідуць жонкі рабочых вагонных майстэрань. На апошнім сходзе жонак рабочых адна ўнесла прапанову аб зборы гэтых каштоўных рэчаў у фонд індустрыялізацыі, дэлегаткі першыя зьнялі пярсьні, завушніцы, крыжыкі і там-жа здалі. У каго ня было з сабой рэчаў—запісаліся і назаўтра прынесьлі.

За першыя 2 дні сабрана: пярсьней залатых 7 штук, срэбных—2, завушніц залатых—3 пары, манет срэбных 72 штукі, лыжак срэбных 6, брошка срэбная 1, крыжыкаў залатых 5, крыжыкаў срэбных 4, ланцужкоў срэбн. 2, пражка срэбная 1, гузікаў срэбн. 4, пярсьцёнкаў срэбных ад салфетак 2, мэдальён 1, брасьлет з грошаў 1, і срэбная жаночая сумка 1.

Гэта яшчэ ня ўсё. Маюцца яшчэ рэчы, якія ня ўзяты на вучот. Кампанія па збору каштоўных рэчаў мае яшчэ тое значэньне, што, уносячы срэбныя і залатыя крыжыкі, магэндоведы (яўрэйскія значкі), падсьвечнікі і іншыя рэчы, жанчына канчаткова рве з рэшткамі рэлігіі. **Левіна.**

Загаворыць радыё.

„Нам малельні непатрэбны, нам трэба клюбы, хаты-чытальні. Мы ў царкву ня пойдзем маліцца, мы ўжо добра ведаем шкоднасьць царквы, касьцёлу і сінагог. Прэч царкву—спадчыну царскай улады. „Мы пойдзем у гэты дом тады, калі там загаворыць радыё,"—заявілі працоўныя жанчыны.

Прысутнічаючыя на сходзе звыш ста асоб аднагалосна прынялі пастанову: маючыяся ў Быхаве цэрквы, сінагогі і касьцёлы здаць пад культасьветныя ўстановы.

Быхаў. **Алеся.**

Прэч багоў.

На сходзе дэлегатка Бурштэйн унесла прапанову, каб рэчы рэлігійнага абіходу: крыжыкі, пярсьцёнкі, падсьвечнікі здаць у фонд індустрыялізацыі краіны. Бурштэйн унесла залаты пярсьцёнак і 2 падсьвечнікі і выклікала ўсіх дэлегатак і жонак сяброў саюзу.

Па гэтаму пачыну праведзен шэраг сходаў, дзе дэлегаткі—ініцыятары здачы рэчаў. На сёньняшні дзень здано 15 пярсьцёнкаў, 3 крыжыкі, абразы, падсьвечнікі, брасьлеткі, завушніцы і шэраг іншых залатых, срэбных і медных рэчаў. Наш прыклад пераняліі школы і іншыя ўстановы гораду. Агульна-гарадзкі сход жанчын выклікаў усе ўстановы і арганізацыі і вынес пастанову:

Патрабуем зьняць усе званы з царквей і перадаць іх у карысьць індустрыялізацыі.

Сабраць падсьвечнікі з сінагог. У дні каляд арганізаваць суботнікі!

Сход зьвярнуўся з просьбай да ЦВК ускорыць разгляд пытання аб перадачы царквы і сінагогі пад культустановы.

Сход заклікае ўсіх працоўных жанчын і дэлегатак БССР пасьледаваць нашаму прыкладу.

Прэч дурман і цемру, уперад да выкананьня пяцігодкі, да новай сьветлай будучыні, да сацыялізму!

Хількевіч С. Д.

Калгасьнікі паляць іконы. (Гомель, калгас імя Дзяржынскага).

Супроць рэлігійнага дурману.

Тыдзень таму назад сяляне Раваніцкага, Грабенскага і Клініцкага сельсаветаў перадалі пад загад сельсавету тры царквы. Просьбу іх аб перадачы Прэзыдыум РВК зацьвердзіў.

30 сьнежня, на сходзе працоўных жанчын г. Чэрвеня, пасьля дакладу аб пахаджэньні рэлігіі і яе клясавай сутнасьці, вынесена самімі жанчынамі пастанова аб перадачы маючыхся ў горадзе: царквы, касьцёла і сінагогі пад кіно, клюб фізкультуры і іншыя культасьветныя ўстановы.

Пастанова прынята аднагалосна ў прысутнасьці каля 300 жанчын. Усе выступаючыя, як адна, адзначылі, што рэлігія—дурман, зброя клясавых ворагаў, трэба вырываць яго з карэньнем. **А. Юшкевіч.**

м. Чэрвень, Менскай акр.

НАВУЧЫ НЯПІСЬМЕННУЮ

9 дзень

Разгледзьце з вучнямі малюнкі ў №№ 18, 20, 21, 22 часопісі і правядзеце гутарку ці прачытайце адпаведны артыкул аб нашым будаўніцтве. У выніку адзначце рост буйнай прамысловасьці і яе кіруючую ролю. Адзначце кіруючую ролю рабочай клясы ў будаўніцтве. Пры чытаньні артыкула аб калгасе, камуне ці савгасе адзначце перавагу буйнай гаспадаркі. Адзначце тэмп нашага будаўніцтва і сацыялістычны характар будаўніцтва. Пры складовай распрацоўцы заданьня падкрэсьліце новыя склады і замалюйце іх. У слове „*Калгасы*“ вылучэньне літары „*л*“ з складу „*кал*“. Вылучэньне літары „*і*“ з складу „*гі*“ ці з папярэдніх складаў „*сі*“, „*лі*“. Пачынайце пісаць словы і сказы, напрыклад: „Лука ў камуну“, „Калман у камуну“ і гэтак далей.

Па матэматычнай грамаце дзяленьне круглых дзесяткаў, але каб атрымоўваць таксама круглыя дзесяткі. Камбінацыя дзяленьня і множаньня. Прыклады:

20 : 2 = 90 : 9 = 80 : 2 : 2 =
40 × 2 : 8 = 100 : 10 × 5 = 20 : 20 =

10 дзень

У сувязі з днём сьмерці Леніна гутарка аб Леніне і камуністычнай партыі. У № 21 партрэт Леніна і артыкул „У партыю Леніна“—матар'ял для гутаркі і чытаньня. Пры складовай распрацоўцы заданьня на першым прыкладзе „*Будуй*“ вылучце „*й*“ не складывае, каб вучні ў далейшым адразу чыталі „*дай*“ і гэтак далей. Літара „*е*“ вылучаецца з складу „*ле*“. Пішыце слова „У. І. Ленін“ і іншыя з знаёмых літар. Новыя склады таксама неабходна замаляваць друкаванымі літарамі.

9.

МЫ БУДУЕМ.
Мы будуем калгасы, саўгасы,
камуны.
Мы будуем заводы-гіганты.
Мы будуем гарады.
Нам работы многа. Заводам
работа.
Калгасам, саўгасам ды камунам
работа.

БУ, ДУ, ЕМ, ГІ, КАЛ.

гі і І кал л Л.

10.

НАКАЗЫ У. І. ЛЕНІНА.
У. І. Ленін даў нам многа наказаў.
Будуй заводы.
Будуй калгасы, саўгасы і камуны.
Дай машыны калгасам, саўгасам
і камунам.
Гані кулакоў.

Па матэматычнай грамаце—усе 4 дзеяньні з круглымі дзесяткамі ў розных комбінацыях, напрыклад:

100 : 2 + 20 = 20 + 30 : 5 =
80 : 4 — 20 = 60 — 30 : 3 =
100 : 5 × 2 — 20 = 50 — 40 + 20 × 3 : 9 =

11 дзень

Матар'ял для чытаньня і гутаркі ў № 22 „*Адзіным фронтам за кастрычнік*“. Растлумачце слова „*Камуна*“, 1) як арганізаваная сельская гаспадарка, у якой няма ўласнасьці для асобных членаў і ўсе члены складаюць адну сям'ю, 2) Дом камуна гарадзкога тыпу—дзе ўсе члены складаюць адну сям'ю, 3) „Камуна“—як сусьветны грамадзкі лад бліжэйшага будучага. Адзначце, што мы ідзем да камуны праз сацыялізм. Сацыялістычная будоўля ў нас ідзе ўзмоцненым тэмпам. Мы будуем сацыялізм у СССР. Мы перажываем пераходны пэрыяд. Цяжкасьці ў барацьбе за сацыялізм. Камуністычная партыя, як адзіны правадыр рабочае клясы ў барацьбе за сацыялізм і за камуну. Пры чытаньні заданьня растлумачце слова „*агульнымі*“—у сэнсе сіламі рабочай клясы. Апіраючыся ў вёсцы на беднату ў саюзе з сераднякамі. Пабудова сацыялізму ў СССР—прыклад для працоўных усяго сьвету.

Вылучэньне літары „э“. Уводзіцца мяккі знак „ь“—як знак мяккасьці зычных гукаў. Пісаньне слоў і сказаў з знаёмых літар. Замалёўваньне новых складаў.

Па матэматычнай грамаце—спачатку нумарацыя лікаў ад 20 і да 100, а потым ад 10 да 20. Практыка паказала, што лягчэй навучыць пісаць 21, 22 і гэтак далей, чым 11, 12, 13... Праверка нумарацыі ўразьбіўку: напішы—83, 98, 29 і гэтак далей.

Зьм. Вінаградаў.

Аўладай навукай.
ЗЫ, ЛЕ, ВУ, БА, ДАЙ.

ле е Е дай й.

У. І. Ленін.

11.

НАША МЭТА—КАМУНА.
Навука Леніна нам дапамога.
Мы абаранілі нашу ўладу і абаронім надалей.
Ворагаў мы пераможам.
Агульнымі сіламі мы будуем
Камуну.
Камуну мы пабудуем. Мы пераможам.
За гэта наша парука.

МЭ, ГЭ, ПЕ, РО, ЖА, ГУЛЬ.

Э э ь

ЦАНА асобнага нумару 10 кап.



Замест сьвяткаваньня „каляд“ будуем трактар.

Марына-Горскі чыгуначны дэлегацкі сход пастанавіў замест сьвяткаваньня каляд зрабіць нядзельнік у карысьць пабудовы трактара імя „Беларускай Работніцы і Сялянкі“.

7-га студзеня (першы дзень каляд) вышаў увесь дэлегацкі сход разам з жаночым актывам пас. Марына-Горкі. Сабралося 45 жанчын. Сярод іх былі жанчыны па 50 год. Нагрузілі два вагоны жыта і зарабілі 20 рублёў, якія згодна пастановы сходу жанчын пойдуць на пабудову трактара.

Чыгуначны дэлегацкі сход выклікае на сацспаборніцтва па антырэлігійнай працы і па збору сродкаў на пабудову трактара імя „Беларускай Работніцы і Сялянкі“ наступныя дэлегацкія сходы Пухававіцкага раёну: дэлегацкія сходы калгасу „Лянцо“, „Камуна Зьвязда“, савгасу „Вялень“.

Жэнпрацаўнік.

Пухавіцкі р-н.

Выклікаем Гомель і Полацак.

Дэлегаткі 2-га раёну Віцебску разгарнулі вялікую работу па збору попелу і грошай на трактар імя „Беларускай работніцы і сяланкі“.

На аб'яднаным дэлегацкім сходзе сабрана 22 руб. Збор сродкаў працягваецца і разгорнуты па ўсяму раёну шляхам выклікаў, падпісных лістоў і гэтак далей.

Дэлегаткі 2-га раёну Віцебску выклікаюць усіх дэлегатак Гомелю і Полацку пасьледаваць нашаму прыкладу і разгарнуць работу па збору попелу і сродкаў на трактар імя „Беларуская Работніца і Сялянка“.

Дэлегаткі 2-га раёну Марковіч і Гесельсон.

Гананар на трактар.

Свой ганарар за допіс, зьмешчаны ў 24 нумары часопісі „Беларускай работніцы і сялянкі“, здаю ў фонд пабудовы трактара імя „Беларуская Работніца і Сялянка“ і выклікаю астатніх рабкорак пасьледаваць прыкладу.

Рабкорка Дорская.

Будзе выканана.

Калі Віцебская акруга ўступіла ў сацыялістычнае спаборніцтва па распаўсюджваньню „Беларускай Работніцы і Сялянкі“, то Гарадоцкаму раёну было патрэбна завербаваць 400 падпішчыкаў.

Але на сёньняшні дзень надта мала яшчэ падпішчыкаў. Толькі Смалоўскі сход сабраў 25 падпішчыкаў, астатні: Беснатоўскі—16 падпішчыкаў, Пальмінка—2, Александрава—9.

У сучасны момант у раёне аб'яўлен конкурс паміж дэлегацкімі сходамі, што больш зацікавіць іх у гэтай працы, падштурхне.

Жураўлёва.

„Беларускую Работніцу і Сялянку“—у масы!

Шлю шчырае прывітаньне часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка“.

Як упаўнаважаная жадаю сказаць аб сваіх посьпехах у гэтай галіне. Упаўнаважанай я працую з 1928 году. За гэты год я завербавала 36 падпішчыц на розныя тэрміны. Зарганізаваны гурток прыхільнікаў часопісі, некаторыя жанчыны пішуць самі ў часопісь.

Праз часопісь жанчыны вёскі Карпілаўка сталі больш сьвядомымі, што відаць з таго, што каляктыўна падпісаліся на 3 пазыку індустрыялізацыі на 45 рублёў.

Усё гэта я лічу як дасягненьні, але-ж малыя. Каб мець значна больш посьпехаў у гэтым напрамку, неабходна праводзіць агульныя сходы падпішчыц, чаго да гэтага часу ня было, таксама зарганізаваць больш сталыя гурткі чыткі, на што зьвярнуць увагу кіраўнікам па працы сярод жанчын.

Рудабелка, Глускага р-ну, Бабруйскай акр.

Гарулева.

„Беларускую Работніцу і Сялянку“—у масы.

Нарада райжанарганізатараў Бабруйскай акругі прыняла пастанову, каб прасунуць часопісь у шырокія масы працоўных жанчын. 10.000 падпішчыц на часопісь павінна быць у Бабруйску да 1-га мая. Нарада выклікала на спаборніцтва Мазырскую акругу.

Уніз зьехалі.

Было ў нас ў Слаўным 50 падпішчыкаў на „Беларускую Работніцу і Сялянку“, а зараз засталося толькі 14, бо новая ўпаўнаважаная сама, як сьлед, з часопісьсю не азнаёміцца і таму ня здольна праводзіць работу па збору падпіскі.

Талочынскі раён. **Друк.**

Павялічылі падпіску на часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка“.

На дэлегацкім сходзе абралі ўпаўнаважаных, якія растлумачвалі сялянкам, які напрамак дае „Беларуская Работніца і Сялянка“ ў працы кожнай дэлегаткі. Выпісалі часопісь, дужа зацікавіліся, цяпер мы маем падпішчыкаў 80 жанчын.

Трэба, каб усе жанчыны пабольш чыталі, каб ніводнай дэлегаткі ня было без „Беларускай Работніцы і Сялянкі“.

Н. Федарынчык.

м. Старыя-Дарогі, Бабруйскай акр.

ГПБ Ср. Ра

Выдавец—Аддзел работніц і сялянак ЦК КП(б)Б. *Рэдактары:* С. Крэмер. Г. Рагазіньнікава.

Друкарня БДВ. Заказ № 1122. У ліку 21.000 экз. Галойлітбел № 857.